Падпіска-2007

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА 3-І КВАРТАЛ І ІІ ПАЎГОДДЗЕ 2007 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях, установлены з 01.07.2007 г.)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8200**	**24600**	**49200**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**7850**	**23550**	**47100**
63858 (ведамасны)	**13000**	**39000**	**78000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**11850**	**35550**	**71100**

СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЧЭРВЕНЯ 2007 г. АЎТОРАК

№ 117 (25982)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

КУПАЛЛЕ АДЗНАЧЫЛІ ЎСІМ МІРАМ

На вялікім сольным канцэрце «Купалле Ірыны Дарафееваў: Фестываль стыхій» сярод гледачоў быў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

У ноч з 24 на 25 чэрвеня, калі па еўрапейскай традыцыі адзначалася Купалле, ля сцен Мірскага замка было шматлюдна — поўная «зала» пад адкрытым небам, перапоўненае закуліссе, ды яшчэ ўсе навакольныя пагоркі літаральна «расцвілі» гледачамі. Да слова, паглядзець на выступленне спявачкі, якая за больш чым 15-гадовую творчую кар'еру дарасла да ганаровага звання «Ірына Дарафеева — твар Беларусі», прыехалі не толькі жыхары Міра, Карэлічаў, Дзятлава, Навагрудка, Гродна, Мінска і іншых беларускіх населеных пунктаў. Прыхільнікі артысткі завіталі ў Беларусь з адносна блізкіх Расіі, Украіны, а таксама далёкіх Кіпра, Турцыі і Грэцыі.

Да арганізацыі канцэрта «Купалле Ірыны Дарафеевай: Фестываль стыхій» падключыліся творчыя сілы Белдзяржфілармоніі, Міністэрства культуры Беларусі, Палаца Рэспублікі, тэлеканала АНТ. На сцэне спявачку падтрымлівалі Прэзідэнцкі аркестр Беларусі, Дзяржаўны ансамбль танца, балет Святланы Гуткоўскай, балет «Pops Foundation», калектыў Бабруйскага харэаграфічнага каледжа, аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь — усяго больш як 300 артыстаў. У прыватнасці, разам з Ірынай Дарафеевай прадставіў новую песню «Сэрца зямлі маёй» Руслан Аляхно, беларуска-украінскім атрымаўся пры ўдзеле заслужанага артыста Украіны Аляксандра Панамарова «Човен», практычна рокопернай стала адна з купальскіх песень пры дапамозе Пятра Елфімава і Георгія Калдуна. Акрамя вельмі любімых і папулярных песень кшталту «Балады», «Спадчыны», «Купалінкі», артыстка прадставіла таксама дзве зусім новыя песні — «Дзве стыхіі» і «Дзяўчына на беразе» (апошнюю спецыяльна для Ірыны напісаў расійскі кампазітар Кім Брэйтбург, які прыбыў на свята ў Мір і, дарэчы, надзвычай высока ацаніў арганізацыйны і мастацкі ўзровень падзеі).

Тэматычна канцэрт быў падзелены на чатыры часткі, за якія адказвалі чатыры стыхіі: Зямля, Вада, Паветра, Агонь. Кожная з іх, акрамя музычнага аздаблення, суправаджалася пастаноўчымі спецэфектамі: рыцарскім паядынкам, лазерным шоў, штучнымі фантанамі, выступленнем факіраў і г.д. Сама спявачка па ходу дзеі паспела змяніць пяць вобразаў і канцэртных убораў. Завяршылася свята — а канцэрт стаў, без перабольшання, вялікім святам — відовішным феерверкам. Нягледзячы на тое, што канцэртам Ірыны Дарафеевай тэлеканал АНТ закрываў цыкл музычных вечароў у Мірскім замку, тэлеверсія Купалля была паказана самай першай — ужо ўчора. Акрамя таго, магчымы паўторны паказаць «Купалле Ірыны Дарафеевай: Фестываль стыхій» 6 ліпеня, на больш звыклае для беларусаў Купалле. На гэты дзень прыпадае таксама 30-годдзе спявачкі. Яна ж сустрэне свой дзень нараджэння на адкрыцці фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», у конкурснай частцы якога сёлета выступае прадстаўнік студыі «Тэатр песні Ірыны Дарафеевай» — спявак Георгій Калдун.

У перспектыве, паводле слоў прадзюсара спявачкі Юрыя Савава, запланаваны выпуск аўдыё- і відэаверсіі канцэрта ў Мірскім замку. Гэта будзе ўжо чацвёрты альбом артысткі, выпушчаны сёлета — калі ўлічваць перавыданні беларускамоўных дыскаў «Каханачка» і «Пульс маіх хвілін».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка наведаў Мірскі замак

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 чэрвеня наведаў Мірскі замак і азнаёміўся з ходам яго рэканструкцыі.

Усяго на рэканструкцыю Мірскага замка плануецца выдзеліць Br160 млрд. Да гэтага часу асвоена амаль Br30 млрд. Як чакаецца, работы будуць завершаны да 2010 года. З 2000 года Мірскі замак уключаны ў Спіс культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

Кіраўнік дзяржавы прысутнічаў таксама на канцэртнай праграме Ірыны Дарафеевай «Купалле Ірыны Дарафеевай: Фестываль стыхій», якая прайшла каля сцен Мірскага замка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Тры бліскучыя вынікі на ЦТ па беларускай мове

На гэтым тыдні на сваю фінішную прамую выходзіць кампанія па правядзенню цэнтралізаванага тэсціравання: апошнюю кропку ў ёй паставіць цэнтралізаваны тэст-экзамен па замежных мовах і хіміі. Між іншым, у мінулыя выхадныя былі абвешчаны вынікі цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай і рускай мовах. Прыемнай нечаканасцю сталі тры стобальныя вынікі па беларускай мове. У кола стобальнікаў трапілі выхаванцы гімназіі № 1 г. Чэрвеня, ліцэя ў Крупках і сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў пасёлку Негарэлае. Летась, нагадаем, самым лепшым аказаўся вынік у 98 тэставых балаў, якія набралі толькі 2 чалавекі. А ў 2005 годзе галоўную «вяршыню» ў 100 тэставых балаў удалося пакарыць двум удзельнікам тэсціравання.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Пракурорскім работнікам і ветэранам органаў пракуратуры Рэспублікі Беларусь

Паважаныя таварышы!

Віншую вас з прафесійным святам — Днём работнікаў пракуратуры і 85-годдзем з дня ўтварэння пракуратуры Рэспублікі Беларусь!

За перыяд свайго існавання беларуская пракуратура ўнесла важкі ўклад у стварэнне асноў прававой дзяржавы і зацвярджэнне законнасці, стала надзейнай апорай прэзідэнцкай улады ў пераадоленні працяглых працэсаў, умацаванні грамадскай бяспекі, правапарадку і стабільнасці.

Ваша прынцыповая дзейнасць, якая абапіраецца на літару закона, здабыла павагу і аўтарытэт у грамадстве. Знаходзячыся на пярэднім краі барацьбы са злачыннымі праявамі, пракуратура забяспечвае стабільную работу ўсяго дзяржаўнага механізма, пазітыўна ўплывае на вырашэнне сацыяльна-палітычных і эканамічных задач.

Ваш прафесіяналізм, высокія маральныя якасці ўмацоўваюць веру людзей у перамогу закона і справядлівасці. Сёння ад вашай настойлівасці, паслядоўнасці, дакладнай і зладжанай работы ў многім залежаць надзейная абарона правоў і свабод грамадзян краіны, інтарэсаў дзяржавы, эфектыўнасць барацьбы са злачыннасцю і карупцыяй.

Упэўнены, што работнікі пракуратуры і надалей будуць годна выконваць свой службовы абавязак. Шчыра жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў у працы, дабрабыту і спакою ў вашых дамах.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

Рэспубліканскай калегіі адвакатаў

Дарагія сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з 85-годдзем беларускай адвакатуры.

Быць адвакатам — не толькі вялікі гонар, але і высокая адказнасць. Вы прысвяцілі сябе служэнню дзяржаве, праву і чалавеку. Вашы веды, уменне і прафесіяналізм запатрабаваны ў розных сферах жыццядзейнасці. Ад якасці паўсядзённай работы юрыстаў у многім залежаць парадак і стабільнасць у краіне.

Прававеды ўносяць важкі ўклад у забеспячэнне непахіснасці канстытуцыйных прынцыпаў, справядлівасці, абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян і арганізацый.

У беларускі адвакацкі корпус уваходзяць высокапрафесійныя юрысты, якія карыстаюцца заслужанай павагай у рэспубліцы. Упэўнены, вы з гонарам выканаеце маштабныя задачы, што стаяць перад вамі.

Будзьце заўсёды вернымі прынцыпам прафесійнай этыкі, адказнымі перад беларускім народам і сваёй Айчынай.

Жадаю далейшых поспехаў у вашай высакароднай працы ў імя росквіту роднай Беларусі.

Здароўя, дабра і шчасця вам і вашым блізкім.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТЫДЗЕНЬ КАРОТКАЧАСОВЫХ ДАЖДЖОЎ

На гэтым тыдні толькі сёння паўднёвыя ветры прынясуць на тэрыторыю краіны кароткачасовае павышэнне тэмпературы да 22—28 градусаў, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 30, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Актыўны атмасферны фронт зацягне да нас сур'ёзныя дажджы, месцамі моцныя ліўні, часам чакаецца шквалістае ўзмацненне ветру да 15—20 м/с, у асобных раёнах магчымы град. Пачынаючы з серады і да пачатку выхадных чакаецца няўстойлівае халаднаватае надвор'е, калі час ад часу будуць назірацца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ад 7 да 14, удзень ад 15 да 23 цяпла. Нават у суботу—нядзелю летняй спякоты не прадбачыцца.

Сяргей КУРКАЧ.

ЧЭХІЯ — НЕБЯСПЕЧНЫ НАПРАМАК

Чэхія стала чарговай краінай, на якую распаўсюдзілася забарона на ўвоз у Беларусь усіх відаў кармоў, кармавых дабавак і мяса птушкі. Прычына — выяўленне на індычынай ферме за 150 кіламетраў ад Прагі смяротнага небяспечнага віруса птушынага грыпу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ТРАГЕДЫЯ НА СПАБОРНІЦТВАХ

Як паведамілі ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, пасля першага этапу чэмпіянату і першынства Беларусі па картынгу яго ўдзельнікі — трэнеры, юныя спартсмены і іх бацькі — адправіліся на тэрыторыю картадрома Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў па вуліцы Макаёнка ў Мінску. У той час як дзеці манеўравалі па картадрому, дарослыя адзначалі завяршэнне турніру. Пасля ўжывання спіртнога адзін з выкладчыкаў на асабістым аўтамабілі «Фольксваген-Транспарцёр» вырашыў паказаць клас, але не справіўся з кіраваннем і ўчыніў наезд на свайго 13-гадовага выхаванца. У выніку дзіця ў цяжкім стане было дастаўлена ў рэанімацыю.

Кар. БЕЛТА.

ЛОСЬ СПРАВАКАВАЎ ДТЗ

Жыхар Салігорска стаў ахвярай дарожна-транспартнага здарэння, у якім аўтамабіль сутыкнуўся з дзікай жывёлай.

У аварыю аўтамантар трапіў на пачатку чацвёртай гадзіны ночы ў Жыткавіцкім раёне на дарозе паблізу вёскі Забродцзе. Кіроўца «Аўдзі» не змог пазбегнуць сутыкнення з ласём, які нечакана выскачыў на дарогу. Вадзіцель атрымаў цялесныя пашкоджанні і быў змешчаны ў бальніцу, на жаль, урачам не ўдалося выратаваць жыццё пацярпеламу.

Ігар ГРЫШЫН.

ЦЭНЫ НА БУЛЬБУ ЗНІЗЯЦЦА

У сталічных магазінах ужо з'явілася ранняя бульба беларускіх сельгасвытворцаў.

Да гэтага ўся маладая бульба завозілася ў Мінск з Расіі, Польшчы, Галандыі, Азербайджана і Ізраіля. З'яўленне ў продажы беларускай бульбы адаб'ецца на цэнах: днямі чакаецца зніжэнне яе кошту. Дарэчы, сёння сярэдняя цана імпартнай маладой бульбы на прадпрыемствах гандлю — 2750 рублёў, на рынках — 3250 за кілаграм, а рознічная цана беларускай, якая пакуль ёсць толькі ў магазінах, — 2250 рублёў.

Вольга ДАЛЕНКА, «Мінск-Навіны».

ЗАДЫМІЎ ТРАМВАЙ

Учора раніцай у Мінску на прыпынку Змітрака Бядулі з-за ўзгарання электраправодкі ў трамваі, які рухаўся па маршруту № 4, пасажырам давялося тэрмінова эвакуіравацца з салона.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, паведамленне аб інцыдэнце паступіла выратавальнікам каля а палоўны дзесятай раніцы. Пажарным, якія прыбылі на месца здарэння, спатрэбілася літаральна дзве мінуты, каб ліквідаваць небяспеку. На шчасце, ніхто з людзей не пацярпеў. 10 чалавек, што ехалі ў трамваі, самастойна пакінулі салон. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай узгарання магло стаць кароткае замыканне.

Ігар ГРЫШЫН.

ДАПАМАГЛІ СЯМ'І Ў БЯДЗЕ

У Новалукомлі міліцыя і выратавальнікі дапамаглі сям'і, якая апынулася ў бядзе.

Як паведамілі ў прэс-службе Дэпартамента аховы МУС Беларусі, нарад Чашніцкага аддзела аховы з складзе міліцыянера-вадзіцеля малодшага сяржанта міліцыі Леаніда Надзежкі і міліцыянера-кінолага радавога міліцыі Дзмітрыя Праскіна даталі з падвала аднаго з гаражоў мужа і жонку, якія фарбавалі там, атруціліся парамі фарбы і страцілі прытомнасць. Суседзі па гаражу своечасова выявілі пацярпелых і выклікалі хуткую дапамогу і разлік МНС, аднак дастаць людзей з пасткі было вельмі цяжка з-за малых памераў люка. Міліцыянеры ацанілі сітуацыю і, выкарыстаўшы процівагазы медыцынскай брыгады, паднялі пацярпелых наверх, дзе іх прынялі выратавальнікі.

Кар. БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СЁННЯ УКРАІНА ГАТОВА ПРАГАЛАСАВАЦЬ ЗА ЯНУКОВІЧА

Калі б датэрміновыя выбары прэзідэнта Украіны адбыліся ў бліжэйшыя выхадныя, то першае месца заняў бы прэм'ер-міністр Віктар Януковіч (29,8 працэнта), другое — лідар Блока Юліі Цімашэнкі (15,4 працэнта), а трэцяе — дзеючы прэзідэнт Віктар Юшчанка (11,6 працэнта). Такія звесткі сацапытання прыводзіць «Інтэрфакс».

У выпадку правядзення парламенцкіх выбараў у чэрвені 2007 года, 27,4 працэнта апытаных падтрымалі б Партыю рэгіёнаў, 16,4 працэнта — БЮЦ, 9,2 працэнта — блок «Наша Украіна», 5,8 працэнта — Камуністычную партыю Украіны, 5,2 працэнта — «народную самаабарону». 33 працэнты апытаных станоўча ставяцца да ідэі датэрміновых выбараў у Вярхоўную Раду, 46 працэнтаў — негатыўна. Пры гэтым 76 працэнтаў рэспандэнтаў маюць намер узяць удзел у датэрміновых парламенцкіх выбарах.

АЗЕРБАЙДЖАНЦАМ ПААБЯЦАЛІ ВЯРНУЦЬ САВЕЦКІЯ НАКАПЛЕННІ

Улады Азербайджана рыхтуюцца вярнуць ашчадныя ўклады насельніцтва, якія былі здадзены на захаванне і засталіся ў банках з савецкіх часоў. Як заявіў старшыня пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы парламента рэспублікі Зіяд Самедзадэ, зараз удакладняецца колькасць укладчыкаў і сума даўгоў.

ПАЛОВА РАСІЯН НЕ ПАМЯТАЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫ СЦЯГ

Апытанне, праведзенае Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі, паказала, што толькі палова расіян ведаюць, як выглядае дзяржаўны сцяг Расійскай Федэрацыі.

На пытанне, выява чаго знаходзіцца на гербе Расіі, правільна адказалі 84 працэнты апытаных. 55 працэнтаў рэспандэнтаў правільна ўказалі колеры дзяржаўнага сцяга РФ і іх размяшчэнне. Правільна назваць першыя словы гімна РФ у ходзе апытання здолелі толькі 34 працэнты расіян.

НАЗВАНЫ САМЫ ПАЧВАРНЫ САБАКА Ў СВЕЦЕ

У 2007 годзе ім стаў кабель па мянушцы Эльвуд з амерыканскага штата Нью-Джэрсі.

Эльвуд — бясшэрсная сумесь кітайскага хахлатага сабакі і чыхуахуа, якая мае цёмную афарбоўку і клок белай шэрсці на галаве. Акрамя таго для гэтай пароды характэрны выпучаныя вочы і язык, які ўвесь час вывальваецца з ляпы. Цікава, што калі пару гадоў таму Эльвуд толькі нарадзіўся, заводчыца хацела яго ўсыпіць, бо палічыла надта пачварным. Тым не менш, паводле слоў новай гаспадыні, якой перамога сабакі на конкурсе прынесла тысячу долараў, Эльвуд — самая мілая істота на свеце.

УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

КАБ НЕ «СЦІСКАЛА» НІ СПІНУ, НІ ГАЛАВУ

Галаўныя болі, галавакружэнні, прафілактыка і лячэнне інсультаў, болі ў пазваночніку — аб гэтым можна распытаць падчас чарговай медыцынскай «прамой лініі» загадчыцу неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі, галоўнага пазаштатнага неўролага Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ганну Віктараўну АСТАПЕНКА. «Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **СЁННЯ з 15.00 да 16.30 па нумарах: (8-017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Канферэнц-зала

СКВАПНЫЯ ПАЛКОЎНІКІ

Генеральная пракуратура расследуе крымінальную справу супраць траіх палкоўнікаў КДБ і МУС, якія падазраюцца ў хабарніцтве

Сёння беларускія пракуроры адзначаюць сваё прафесійнае свята. Прычым айчыннай пракуратуры споўнілася роўна 85 гадоў. З нагоды юбілею ўчора адбылася прэс-канферэнцыя Генеральнага пракурора краіны Пятра МІКЛАШЭВІЧА.

«Гучныя справы»

Кіраўнік Генеральнай пракуратуры падкрэсліў, што перад законам усе павінны быць роўныя. «Недатыкальных асобаў у нашай краіне няма», — адзначыў Пётр Міклашэвіч. У якасці прыкладаў бескампраміснай барацьбы пракуратуры з карупцыяй ён прывёў некалькі «гучных спраў». Сярод іншага Генеральны пракурор паведаміў некаторыя падрабязнасці расследавання крымінальнай справы, узбуджанай супраць кіраўніка «Белнафтахіма» Аляксандра Бароўскага. Гендырэктар канцэрна падазраецца ў парушэнні адразу трох артыкулаў Крымінальнага кодэкса. У прыватнасці, яму інкрымінуецца крадзеж у асабліва буйных памерах, злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі і рассакрэчванне звестак, якія складаюць службовую тайну. Уся незаконная дзейнасць спадара Бароўскага, паводле слоў Генпракурора, звязана з пастаўкамі расійскіх нафтапрадуктаў і іх рэалізацыяй, а ўрон складае «не адзін мільён долараў». Разам з Аляксандрам Бароўскім затрыманы іншыя кіруючыя асобы «Белнафтахіма», а таксама прадстаўнікі камерцыйных структур. Генеральны пракурор не назваў дакладную колькасць асобаў, якія фігуруюць у гэтай «гучнай» справе. Ён толькі заявіў, што разам з кіраўніком «Белнафтахіма» былі затрыманы яшчэ 5—6 чалавек. Больш падрабязна паведаміць пра «справу Бароўскага» Пётр Міклашэвіч адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што Камітэтам дзяржбяспекі яшчэ не завершана расследаванне.

Дарэчы, і ў саміх спецслужбах не так даўно здарыўся карупцыйны скандал. Паводле звестак Генеральнага пракурора, супраць двух палкоўнікаў КДБ, адзін з якіх дзеючы, і палкоўніка МУС была ўзбуджана крымінальная справа. Уся «тройца» падазраецца ў атрыманні хабару ў асабліва буйных памерах. Расследаванне справы пачалося нядаўна, таму кіраўнік пракуратуры і на гэты раз не стаў паведамляць падрабязнасці.

А вось «гучная» справа, дзе фігуруюць супрацоўнікі Гродзенскай рэгіянальнай мытні і іх калегі з «Заходняга Буга», выйшла на фінішную прамую. Пётр Міклашэвіч нагадаў, што мытнікі некалькі гадоў таму стварылі цэлую злачынную арганізацыю, якая пад выглядам будматэрыялаў займалася перамяшчэннем праз нашу мяжу камп'ютараў, бытавой тэхнікі і іншых каштоўных тавараў. Маштабы дзейнасці гэтай арганізацыі настолькі вялікія, што яе ўдзельнікаў будуць судзіць у некалькі заходаў. «Першая партыя» паўстане перад судом ужо ў ліпені. На лаве падсудных апынуцца 22 чалавекі, у тым ліку 9 мытнікаў. Урон, які нанесла нашай дзяржаве гэтая злачынная група, паводле слоў Пятра Міклашэвіча, складае больш за 24 мільярды рублёў.

Прыкладна праз 3 месяцы пачнецца працэс над «другой партыяй» нядобрасумленных мытнікаў і іх памагатых, якія нанеслі ўрон інтарэсам Беларусі на суму 90 мільярдаў рублёў. Як адзначыў Генеральны пракурор, «другім заходам» будуць судзіць ужо каля 50 чалавек, з якіх 25 — супрацоўнікі мытні.

Ён паведаміў, што расследаванне гэтай справы знаходзіцца пад асабістым кантролем кіраўніка дзяржавы.

Пракуратура — аўтарытэтная структура

Пётр Міклашэвіч падкрэсліў, што пракуратура з'яўляецца не толькі адной з асноўных частак праваахоўнай сістэмы нашай краіны, але і ажыццяўляе нагляд за выкананнем законнасці, абараняе правы і інтарэсы як усёй дзяржавы, так і асобных грамадзян. За мінулы год і сёлета ў органы пракуратуры ў пошуках справядлівасці звярталіся больш за 60 тысяч грамадзян. Скаргі 12 тысяч чалавек былі прызнаны абгрунтаванымі і пракуроры прынялі меры, каб аднавіць справядлівасць. Пракуроры таксама ажыццявілі больш за 20 тысяч праверак выканання заканадаўства ў органах ўлады, ва ўстановах і на прадпрыемствах. Па выніках гэтых праверак кіраўнікам было вынесена больш за 41 тысячу прадстаўленняў і прадпісанняў аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў. Да адміністрацыйнай, матэрыяльнай і дысцыплінарнай адказнасці прыцягнута амаль 50 тысяч службовых асобаў. Па патрабаванню пракуратуры дзяржаве кампенсаваны ўрон амаль на 141 мільярд рублёў. Як падкрэсліў Пётр Міклашэвіч, пракуратура — аўтарытэтная структура. Сёння няма фактычна ніводнай сферы, за якой бы не сачыла пільнае пракурорскае вока. Зараз, дарэчы, у органах беларускай пракуратуры працуе 1940 чалавек, у тым ліку 434 жанчыны. Паводле слоў Пятра Міклашэвіча, сённяшні калектыў пракуратуры — гэта маналітны корпус выдатна падрыхтаваных спецыялістаў. Карыстаючыся выпадкам, Генеральны пракурор павіншаваў калег з прафесійным святам і падзякаваў за добрасумленную і прынцыповую працу.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Рэпартаж з колаў

КОЖНАЯ СУСТРЭЧА — МАЛЕНЬКАЕ СВЯТА...

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 19, 21 і 23 чэрвеня.)

Калі шанцуе, то шанцуе!

...Па дарозе на Быхаў прыкінулі — раёнаў, дзе ні разу (пакуль) «не прызямляўся» маленькі звяздоўскі дэсант на карце, амаль не засталося: у Маларыцкім, шкада, не былі, у Астравецкім, Брагінскім, Ушацкім... Затое тройчы — і з халадзільнікамі, тэлевізарамі — на Маладзечаншчыне, двойчы — у Гродне, у Свіслачы... Да таго ж (як высвятлялася потым, падчас іх уручэнняў) асобныя, прычым з істотных звяздоўскіх прызоў, траплялі, можна сказаць, у адну сям'ю — да нявесткі з Гомеля і да свёкра са Жлобіншчыны, да брата з Магілёва і сястры са Слаўгарада...

І ўсё ж гэта здзіўляе менш, чым той факт, што Васілю Андрэевічу Калініну з вёскі Чырвоная Беларусь шанцавала ў латарэі... тройчы.

Адразу ж прызнаемся і пашкадуем — размаўляць са шчаслівучыкам досыць складана. Васілю Андрэевічу ўжо дзевяты дзесятак, ваяваў (асколак у пазваночніку носіць дагэтуль), з гадамі страціў слых. Таму форма зносінаў была такой — пытанні пісалі на паперы, ён чытаў, адказваў...

У чым яму ахвотна дапамагалі аднавяскоўцы. І ў першую чаргу, зразумела ж, яго сацыяльны работнік Алена Іванаўна Міткевіч. У выніку мы даведаліся, што працаваў Васіль Андрэевіч слесарам на чыгунцы, выгадаваў дваіх дзяцей, жыве адзін (жонка даўно памерла), але, па магчымасці, годна: глядзіць за парадкам у доме і каля яго, сваімі рукамі сабраў трактар, трымае дагэтуль казу, газету чытае — ад дошкі да дошкі, як кажуць. І выйграе. Бо, па-першае, як прызнаўся, адчувае сябе «ў курсе» ўсяго, што адбываецца навокал, па-другое — знаходзіць шмат парад па лячэнню хвароб, па вядзенню гаспадаркі, а патрэцяе — проста пастаянна дасылае карткі на розыгрыш прызоў.

— У першы раз, ужо даўно — расказваў усім у клубе, — выйграў майку з надпісам «Звязда», яе па пошце прыслалі, у другі раз — чатырохражковы свяцільнік, у трэці — во гэту мікрахвалевую печ.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

«Цёплая печ, хоць косці і не пагрэеш», — лічыць Васіль КАЛІНІН з вёскі Чырвоная Беларусь.

ISSN 1990 - 763X

07117>

9771990763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.06.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 884,49
1 латвійскі лат	4 142,93
1 літоўскі літ	835,43
1 чэшская крона	100,42
1 польскі злоты	761,08
1 расійскі рубель	82,82
1 украінская грыўня	427,50

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,9010
10 UAH	51,3328
1000 BYR	12,0477
EUR	34,8472

Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.06.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падлічыцца на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 200-69-01.

Пасля выступлення «Звязды»

УМОВЫ ПАЛЕПШЫЛІСЯ

У газеце за 21 красавіка быў надрукаваны артыкул «Крыўдзіцца ці не?», напісаны па скарзе групы пацыентаў Кіраўскай бальніцы сястрынскага догляду, што ў Жлобінскім раёне. Сутнасць яе заключалася ў тым, што людзі былі незадаволены ўмовамі, якія створаны там, асабліва павышэннем платных медыцынскіх паслуг.

Як паведаміў нам намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Валяр'ян Кароль, у дадзенай медыцынскай установе, як і ў астатніх падобных ёй, пацыентам прадастаўляецца медыка-сацыяльная дапамога, якая ўключае ў сябе медыцынскі нагляд і догляд, лячэбнае харчаванне, комплекс сімптаматычнай тэрапіі і метадаў фізічнай рэабілітацыі і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку іхняй актыўнай жыццядзейнасці.

Фактычны кошт знаходжання чалавека ў бальніцах сястрынскага догляду залежыць ад расходаў на іх утрыманне. Для прыкладу, на Гомельшчыне функцыянуе шаснаццаць такіх устаноў, і кошт знаходжання пацыента ў іх на працягу сутак розны (Петрыкаўскі раён — 10,5 тысячы рублёў, Добрушскі — 17,4, Жлобінскі — 26,7 тысячы). Адлічэнні ад пенсіі кампенсуюць пры гэтым усяго каля сарака працэнтаў указаных расходаў.

Трэба заўважыць таксама, што кошт знаходжання пацыента ў бальніцы сястрынскага догляду вызначаюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Памер аплаты ў іх у рэспубліцы вагаецца ад 70 да 90 працэнтаў. Дык вось на аснове рашэння Жлобінскага райвыканкама ад 17 сакавіка 2007 года з пацыентамі Кіраўскай бальніцы сястрынскага догляду былі перазаключаны дагаворы за іх знаходжанне там у памеры 90 працэнтаў пенсіі, а для ўдзельнікаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны — 70 працэнтаў.

Што датычыцца харчавання пацыентаў бальніцы, дык упраўленне аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама паведаміла, што яго кошт пасля выступлення газеты павялічаны з 3200 да 4000 рублёў за суткі знаходжання там чалавека. Прымаюцца ўсе неабходныя меры па выкананню натуральных нормаў у памеры ста працэнтаў. Дадаткова пацыентам выдаюцца фрукты (яблыкі, апельсіны, мандарыны), з 20 да 30 грамаў павялічана сярэднясутачная норма па кандытарскіх вырабах (пячэнне, зефір, пернікі, вафлі), пададзена заяўка ў гандлёвую сетку на закуп ёгурту, глазураваных сыркоў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Нельга загаварыць праблему і затармазіць дэбюракратызацыю

Гэту думку падкрэсліў Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Генадзь Нявыглас на семінары-нарадзе ў Гродне, дзе разглядаліся пытанні выканання Дырэктывы кіраўніка дзяржавы «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату» і ўдасканалення ідэалагічнай работы. Такія мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх абласцях рэспублікі з мэтай разабрацца ў недапрацоўках і вызначыць стратэгічныя задачы дзяржаўнага апарату і яго ідэалагічнай вертыкалі ў рабоце з людзьмі.

Сярод існуючых праблем начальнік управлення юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Сянькевіч адзначыў кадравае забеспячэнне службаў «адно акно», паляпшэнне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы, размяшчэнне ў адным будынку, каб было зручна кліентам. На парадку дня таксама стварэнне лакальных камп'ютарных сетак (з базай даных для розных службаў) у райвыканкамах і агульнарэспубліканскай базы даных для абмену інфармацыяй паміж дзяржаўнымі арганізацыямі.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка пацікавіўся ў начальніка ўпраўлення юстыцыі сітуацыяй з натарыяльным абслугоўваннем насельніцтва. Быццам бы ўсё нармальна, але чаму ж тады ў аблвыканкам ідуць скаргі, што ў некаторых рэгіёнах вобласці да натарыуса трапіць праблематычна? Прывёў Уладзімір Саўчанка і прыклад з цэментам: «Мне дакладваюць, што ён у продажы ёсць, пасылаю вадзіцеля ў магазіны — праблема».

Кіраўнік аблвыканкама даў зразумець, што будзе рашуча спыняць усе спробы прыхарашыць рэальнае становішча спраў, выдаць жадаемае за сапраўднае. Каб не дапусціць гэтага, ён паабяцаў правесці рэйдавыя праверкі ў тых жа натарыяльных канторах, у разлікова-касавых цэнтрах. А найбольш вострай праблемай Уладзімір Саўчанка лічыць кадравую, за чаго, здараецца, цяжка знайсці кіраўніка на тую ці іншую пасаду. «Тасуем адну «калоду картаў». На думку старшыні аблвыканкама, неабходна наладзіць дакладную сістэму падрыхтоўкі кадраў для вобласці, цесна супрацоўнічаць з кіраўнікамі ВНУ, уважліва сачыць за далейшым лёсам сваіх хлопцаў і дзяўчат і стварацца такія ўмовы, каб яны пасля вучобы вярталіся ў раён.

Першыя крокі ў гэтым накірунку ў вобласці ўжо робяцца. Згодна з інфармацыяй намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыі Біруковай, сфарміраваны састаў «Школы будучага кіраўніка». Студэнты трэціх-чацвёртых курсаў ВНУ на працягу двух гадоў не толькі атрымаюць адпаведныя тэарэтычныя асновы, але будуць праходзіць практыку ў аддзелах аблвыканкама. Мяркуецца, што тым самым будзе створаны рэзерв кадраў кіраўнікоў для вобласці.

Паводле ацэнкі Генадзя Нявыгласа, часта чыноўнікі гавораць правільныя словы, а робяць зусім не так, як трэба. Не заўсёды прыём у дзяржаўных органах наладжаны ў зручны для людзей час, ад іх, здараецца, патрабуюць непрадугледжаныя заканадаўствам дакументы, парушаюцца тэрміны разгляду зваротаў. У шэрагу арганізацый па-ранейшаму вялікія чэргі, а запіс грамадзян на прыём, іх кансультаванне праводзяцца без уліку сучасных патрабаванняў. Якая карысць ад добрай забяспечанасці дзяржаўных органаў камп'ютарамі, калі выкарыстоўваецца хіба што дзесятая частка іх магчымасцяў?

Электроннай поштай карыстаюцца дрэнна, метады працы ў Інтэрнэт-прасторы многіх дзяржорганаў дзедаўскія, а вось папяровая перапіска, адзначыў Генадзь Нявыглас, па- ранейшаму працвітае, асабліва ў звяне «раён—вобласць».

Адказнасць за парушэнне правілаў работы з людзьмі, падкрэсліў Генадзь Нявыглас, будзе ўзмацняцца. Разам з тым будуць арганізаваны шырокая растлумачальная работа і вучоба чыноўнікаў. Са свайго боку, яны павінны пераканаўча, нефармальна праводзіць інфармацыйную работу сярод насельніцтва, шырока практыкаваць для гэтага «гарачыя лініі», якія, дарэчы, з'яўляюцца адным з лепшых спосабаў скарачэння паператорчасці. Вельмі ўважлівага падыходу патрабуе і рэагаванне на звароты грамадзян у дзяржаўныя органы, асабліва калектыўныя — яны павінны разглядацца ў першую чаргу, з выездам на месца.

— Галоўная праблема — пазбавіцца бюракратычных перашкод у працы дзяржаўных органаў. Мы поўныя рашучасці давесці гэту работу да канца, — сказаў Генадзь Нявыглас.

На думку кіраўніка прэзідэнцкай Адміністрацыі, ідэалагічная вертыкаль у краіне эфектыўна функцыянуе і ўкамплектавана кваліфікаванымі кадрамі. Галоўнае — ідэалагічная вертыкаль патрэбна людзям, яны шукаюць у яе падтрымку. І мы не маем права людзей падмануць, падкрэсліў Генадзь Нявыглас. Памятаеце крылатую фразу са знакамітага кінафільма: «Домакіраўнік — сябар чалавека»? Дык вось, можна сказаць і так: «Ідэолаг — сябар чалавека». І гэта, лічыць Генадзь Нявыглас, трэба разумець літаральна і без усякай іроніі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **44 дні**

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ГЛАЗ:

«Звязда» — аснова беларускіх друкаваных СМІ»

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

— Маё знаёмства са «Звяздой» адбылося ў юнацтве, калі я быў студэнтам эканамічнага факультэта Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. У газеце напісалі пра мяне як пра грамадскага актывіста і ленінскага стыпендыята.

Цяпер я чытаю «Звязду», але з прычыны вялікага інфармацыйнага аб'ёму гэта часцей за ўсё выбраныя артыкулы, якія ў асноўным асвятляюць жыццё Магілёўскай вобласці.

Я адношу «Звязду» да аднаго з самых паважаных выданняў у рэспубліцы. Газета прайшла вельмі нялёгкі, гераічны шлях. Былі ўзлёты, былі і падзенні, аднак менавіта гэта выданне мае, вобразна кажучы, шкілетны характар. «Звязда» захоўвае асноватворную ролю для публіцыстыкі і беларускіх СМІ, асабліва ў крытычныя моманты жыцця нашай дзяржавы. «Звязда» была для беларусаў галоўнай газетай у Вялікую Айчынную вайну. Так што гэта выданне — з моцным падмуркам.

І перспектывы ў «Звязды» добрыя: яна цяпер разам з іншымі беларускімі друкаванымі выданнямі мяняе падыходы і імідж у сучасных умовах, калі трэба суседнічаць з электроннымі СМІ. І яшчэ адна адметнасць: журналісты «Звязды» аднолькава адказна падыходзяць да ўсіх рубрык — ад спорту да палітычнага жыцця краіны.

Я віншую газету з надыходзячым 90-гадовым юбілеем. Жадаю «Звяздзе» працвітання, вялікіх накладаў, удзячных падпісчыкаў і творчага росту на радасць усім чытачам. А супрацоўнікам газеты — здароўя!

Лілія ЧЫГІР:
«ЧЫНОЎНІКАЎ ТРЭБА ПРЫВУЧАЦЬ КАЗАЦЬ ЛЮДЗЯМ ПРАЎДУ»

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці Лілія Мікалаеўна Чыгір — магіляўчанка, паводле адукацыі — будаўнік і эканаміст. Яна працавала ў будаўнічым трэсце № 12 Магілёва, а ў 1995 годзе прыйшла на працу ў КДК. Амаль чатыры гады таму Лілія Мікалаеўна была прызначана на пасаду старшыні Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці.

— Лілія Мікалаеўна, ці трэба супрацоўнікам КДК валодаць нейкімі асаблівымі якасцямі?

— Патрабаванні вялікія, але мне падаецца, што такія якасці павінны быць ва ўсіх нармальных людзей. Гэта, канешне, маральнасць. Высокі ўзровень прафесіяналізму. У нашым камітэце працуюць людзі адукаваныя: трэць супрацоўнікаў маюць «чырвоныя» дыпломы і школьныя медалі. Большасць мае некалькі адукацый. Аднак наш чалавек павінен не толькі валодаць ведамі, але і разумець таго, каго правярае. Таму супрацоўнікі камітэта маюць стаж працы на вытворчасці.

І абавязкова кантралёру трэба мець вытрымку і характар, які выклікае прыхільнасць. Мы зносімся з людзьмі, якіх правяраем, і яны маюць стрэс ужо толькі ад таго, што прыйшлі кантралёры. І ніякіх эмацыйных выбухаў, бо трэба паслядоўна разабрацца ў складанай сітуацыі. За высновамі, якія робіць кантралёр, стаяць лёсы людзей.

— На якія сферы дзейнасці зараз накіравана ўвага КДК Магілёўскай вобласці?

— Напрамкаў шмат, усе яны вызначаны заканадаўствам аб дзейнасці Камітэта дзяржкантролю. Адзін з іх — кантроль за выкарыстаннем бюджэтных сродкаў.

Напрыклад, мы правяралі, як выкарыстоўваліся грошы, выдаткаваныя на «Дажынкі-2006» у Бабруйску. Праверка вялася на працягу трох месяцаў разам з іншымі кантрольнымі органамі, бо падрадчыкаў было зашмат. У выніку знайшлі шматлікія выпадкі бессістэмнага і неэфектыўнага выкарыстання, прыпісак і завышэння кошту выкананых работ. Агульная сума — больш за 800 мільёнаў рублёў.

Аднак найбольш мяне ўразіла мінская фірма «Трыномлюкс». Яны завысілі расцэнкі на рамонту фасада аднаго з жылых дамоў аж у 22(!) разы. Гэтая ж фірма павінна была выканаць земляныя работы для рэгулявання рэчышча ракі: добра, што зіма была без снегу, і кантралёры, якія прыйшлі на аб'ект, убачылі дакладна, што там ніхто і рыдлёўкай не капнуў. Карацей, фірма атрымала за кошт прыпісак больш за 200 мільёнаў рублёў. Аднак найбольш мяне здзівілі паводзіны дзяржаўных людзей, што падпісвалі працэнтоўкі. Яны, прама скажам, вольна абышліся са сродкамі падаткаплацельшчыкаў. Грошы, канешне, у бюджэт вярнуліся, пакараны паводле вынікаў праверак 46 службовых асобаў.

Цяпер вялікая ўвага надаецца развіццю аграпрамысловага комплексу. Усе праграмы, накіраваныя на развіццё АПК, кантралююцца намі. Летась у сельскагаспадарчых арганізацыях мы выявілі неэфектыўнае выкарыстанне сродкаў — амаль на 1,5 мільярда рублёў. Напрыклад, у Слаўгарадскім раёне забяспечвалі гаспадаркі ўгнаеннямі і сродкамі абароны раслін без уліку іх рэштаў на пачатак года: калі б палічылі правільна, то можна было эканоміць больш за мільярд рублёў. У Быхаўскім раёне комплексная праверка выявіла звыш мільярда рублёў бюджэтных сродкаў, якія неабгрунтавана атрыманы, незаконна і не па мэтаваму прызначэнню выкарыстаны. У гэтым раёне кожная трэцяя сельская гаспадарка рабіла прыпіскі пра стан жывёлагадоўлі.

Увогуле, мы змагаемся з прыпіскамі ў дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці. Напрыклад, летась яны выяўлены ў 22 гаспадарках. Сельгасарганізацыі агулам прыпісалі больш за 1700 тон збожжа, 50 тон бульбы, больш за 1000 тон саломы, больш за 30 тон прывагі буйной рагатай жывёлы і г.д.

Мы сочым таксама за выкарыстаннем і захаваннем дзяржаўнай маёмасці. Напрыклад, сёлета правяралі безгаспадарную ўласнасць, якая не выкарыстоўваецца. Ва УКСП «Саўгас «Магілёўскі» комплекс па адкорму буйной рагатай жывёлы даўно стаіць разрабаваны: з будынкаў зняты шыфер, вокны, дзверы і іншае. З 2001 года мясцовы фермер звяртаўся да кіраўніцтва раёна з просьбамі перадаць яму ў карыстанне комплекс, аднак адказаў ён так і не атрымаў. І толькі пасля праверкі КДК будынкі перадалі іншай гаспадарцы для завяршэння будаўніцтва і далейшага выкарыстання.

— У чым корань правапарушэнняў, якія выяўляюцца КДК: гэта няведанне законаў, грэбаванне імі альбо безадказнасць?

— Не на ўсіх прадпрыемствах ёсць юрысты і падрыхтаваныя бухгалтары. Мне падаецца, што няма такога чалавека, які хацеў бы рабіць дрэнна, бо гэта ж праверкі, спагнанні, адміністрацыйная адказнасць... Усе хочуць рабіць правільна, аднак не ўсе на гэта здольныя — у нас складаная нарматыўная база. Трэба абавязкова стаць карыстальнікамі электроннай базы законаў і нарматыўных актаў. Аднак далёка не ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў лічаць гэта за неабходнасць, некаторыя — за лішнюю раскошу. І гэта не грэбаванне законам, а, хутчэй, надзея на авось. Трэба не эканоміць на юрыстах і памятаць, што няведанне заканадаўства не вызваляе ад адказнасці за яго невыкананне.

За мінулы год і сёлетнія чатыры месяцы за розныя парушэнні заканадаўства Камітэтам прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 1623 чалавекі. А калі парушэнні робяцца наўмысна, то гэта мяжуе з крымінальнай адказнасцю. За гэты ж перыяд, паводле матэрыялаў нашых праверак, праваахоўныя органы распачалі 108 крымінальных спраў.

Напрыклад, правяралі Дрыбінскі УКП «Жылкамгас». Выявілі, што на працягу двух гадоў прадпрыемства набывала розныя тавары — харчы, канцылярскія прылады і іншыя, але

яны не ўлічваліся афіцыйна, імі карысталіся ў асабістых мэтах некаторыя службовыя асобы. З ведама дырэктара больш за паўгода да кіравання службовым аўтамабілем без вадзіцельскага пасведчання дапускаўся яго сын. І стос іншых парушэнняў заканадаўства: урон склаў больш за 2 тысячы еўра. Дырэктар вызвалены ад пасады, галоўны бухгалтар і механік пакараны штрафамі. Эканамічныя санкцыі да прадпрыемства склалі 21 мільён рублёў. А для прававой ацэнкі матэрыялы перададзены ў праваахоўныя органы.

— Калі прааналізаваць вынікі праверак і дзейнасці Камітэта дзяржкантролю, то ці можна сказаць, што стала болей выканаўчай дысцыпліны і законнасці?

— Безумоўна, дысцыпліны і парадку стала болей — гэта я вам скажу як работнік вытворчасці ў былым. У перабудовачныя 1990-я гады былі практычна знішчаны рэвізорскія службы: каб выжываць, скарачалі людзей, і ў першую чаргу рэвізораў. І калі я прыйшла ў Камітэт і давялося бываць у будаўнічых арганізацыях на праверках, то выявілася, што ў паперах нічога нельга было зразумець, настолькі дрэнна вялася дакументацыя.

Гадоў дзесяць таму кантралёры знайшлі гаспадарку, дзе бухгалтарскі ўлік вёўся слупкамі: мы вінныя, нам вінныя. Цяпер гэта моцнае і вядомае за межамі вобласці сельскагаспадарчае прадпрыемства. Ёсць, праўда, яшчэ слабыя сельгаспрадпрыемствы ў глыбінцы, дзе няма добрага бухгалтарскага ўліку. Але яны падцягнуцца. Спадзяюся, што рэструктурызацыя гаспадарак выправіць сітуацыю да лепшага.

Ведаеце, напэўна, чалавек так уладкаваны, што яго павінны кантраляваць. Калі ён ведае, што да яго прыйдуць і правераць, ён будзе рабіць належным чынам.

— Днямі выйшла новая Дырэктыва кіраўніка дзяржавы, якая датычыцца пытанняў энергазберажэння і эканоміі.

— Праверкі па энергабяспецы мы праводзілі пастаянна. Калі правяраем прадпрыемства, то гэта адно з абавязковых пытанняў. Як ідзе расходаванне энергіі, ці нармірована яна, ці пастаўлены прыборы ўліку... А цяпер гэтым пытанням будзе надавацца яшчэ больш увагі.

— Многія прадпрыемствы і ўстановы скардзяцца, што праверак усё ж такі шмат. Ці ўдаецца скаардынаваць працу кантралёраў розных ведамстваў і арганізацый?

— Я лічу, што ўдаецца. Працуе Савет па каардынацыі кантрольнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, які ўзначальвае Старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон Ломаць. Саветам праводзіцца вялікая арганізацыйная работа, і, на мой погляд, ёсць добрыя вынікі. У Магілёўскай вобласці каардынацыйны Савет узначальваю я. Адпаведныя структуры створаны і ў раёнах.

Раней у кожнага кантрольнага органа (усяго іх у нас 42) быў свой план, а цяпер фарміруецца каардынацыйны план кантрольнай дзейнасці на аснове спецыяльнай камп'ютарнай праграмы, якую распрацавалі супрацоўнікі КДК. Усе намаганні Савета накіроўваем супраць выслоўя Казьмы Пруткова, які казаў, што нельга ахапіць неабдымнае. Усяго за 2006 год і першы сёлетні квартал скаардынаваны з кантрольнымі органамі Магілёўшчыны і праведзены больш за 12 тысяч праверак.

Спробы каардынацыі пачаліся яшчэ ў 2003 годзе, а летась наступіў пералом, калі былі ўведзены некаторыя непапулярныя меры: адміністрацыйная і дысцыплінарная адказнасць за праверку без узгаднення. Камітэт ужо прыцягнуў да адказнасці двух кіраўнікоў, якія неправамерна прызначылі праверкі, а таксама больш за сотню кантралёраў, якія няправільна зрабілі запісы ў кнігу ўліку праверак. Гэта, скажу вам, дзейсны рычаг.

А колькасць праверак скарацілася. На некаторых прадпрыемствах — больш чым у 4 разы.

— Як вядома, праца са зваротамі людзей — важны накірунак дзейнасці Камітэта дзяржкантролю.

— Так, у нас ёсць тэлефон даверу, мы праводзім гарачыя тэматычныя лініі. І ёсць такія тэлефанаванні, па якіх разбіраемся і сапраўды выяўляем парушэнні. Напрыклад, літаральна днямі разбіраліся па звароту жыхароў дома па вуліцы Якубоўскага ў Магілёве. Індывідуальны прадпрымальнік незаконна зрабіў прыбудову, але нават зямлю пад гэта не афарміў. Фактычна гэта быў самазахоп пры патуранні ўпраўлення архітэктуры горада. Жыхар дома патэлефанаваў нам па тэлефоне даверу ў выхадны дзень: чалавек сказаў, што куды толькі ўжо ні звярталіся, і засталася адна надзея — на Камітэт дзяржкантролю. Зараз прыбудова знішчана, забудоўшчык страціў каля 12 тысяч долараў.

— КДК сапраўды ўспрымаецца людзьмі як апошняя інстанцыя. На што больш за ўсё скардзяцца простыя людзі? І як камітэт выратавае іх праблемы?

— Найбольшая колькасць зваротаў звязана з праблемамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Можа, гэта ад таго, што на ўсё грошай не хапае? Што нельга ўсім адразу, напрыклад, адрамантаваць дах? Некалькі гадоў таму мы правяралі гэту сферу і выявілі, што там не існавала 2-гадовых і 5-гадовых планаў капітальнага рамонту жыллёвага фонду. Цяпер гэта выпраўлена, і людзям можна гаварыць: ваша чарга падыдзе ў канкрэтны час. Чалавек будзе ведаць і не будзе хвалявацца. Трэба людзям казаць праўду.

Ёсць паведамленні і пра злоўжыванні ўладай. Але далёка не заўсёды гэта пацвярджаецца — толькі нязначны працэнт ад агульнай колькасці. Апошнім часам павялічылася колькасць зваротаў па працоўнаму заканадаўству. Паводле аналізу, кожны дзесяты зварот — пра праблемы працы і заробку.

— А ў Камітэце разглядаюцца ўсе звароты?

— Чытаюцца і слухаюцца — усе. А вось разбіраюцца — не. Напрыклад, піша жанчына: у маёй суседкі пяць пярсцёнкаў на кожнай руцэ, тры футры і два аўтамабілі. Зразумела, што ў заяўніцы ёсць смяротны грэх — зайздрасць. Але калі ёсць нейкія намёкі на эканамічныя правапарушэнні, то мы імкнёмся адпрацаваць іх разам з фінансавай міліцыяй.

Увогуле практыка паказвае, што ў большасці выпадкаў у сваіх зваротах у КДК людзі ўказваюць, што раней яны звярталіся да органаў улады альбо ў розныя службы, аднак з-за бяздзейнасці, некампетэнтнасці, фармалізму і непрафесіяналізму асобных службовых асобаў вымушаны пісаць у Камітэт.

— Цяпер людзі скардзяцца, што чыноўнікі даюць своечасовыя адказы на скаргі, але па сутнасці яны — фармальныя, адпіскі. Можа, гэта новая хвароба чыноўніцтва?

— За цяганіну прымаем самыя жорсткія меры. Аж да ўнясення прапаноў аб вызваленні ад займаемай пасады. І здымаем вострыя праблемы са свайго кантролю толькі пасля іх вырашэння.

Калі праводзілі «прамую лінію» па праблемах жыллёва-камунальнай гаспадаркі, то да нас паступіла больш за 400 тэлефанаванняў з усіх куткоў вобласці. Усе звароты былі накіраваныя тым, хто павінен выконваць гэту працу. Дзесятая частка адказаў выклікала сумненні, і пасля іх праверкі аказалася, што трэць з іх — несапраўдная інфармацыя. Напрыклад, нам адказвалі, што ўсё адрамантавана: прыкладалі распіскі жыхароў, а здарылася, што нават некаторыя з іх былі фіктыўныя. Нам хлусілі Крычаўскі раён, гарады Магілёў і Бабруйск... За гэта нямала службовых асобаў прыцягнута да дысцыплінарнай адказнасці.

Яшчэ адзін прыклад. У Камітэт звярнуліся жыхары аднаго з дамоў у Кіраўску наконт холаду. Цяганіна доўжылася 5 гадоў. Шматлікія камісіі так і не здолелі выявіць прычыны неадпаведнасці тэмпературнага рэжыму. І пакуль людзі не звярнуліся на «прамую лінію», так і працягвалася. Зараз знойдзена прычына, прымаюцца належныя меры, каб выправіць становішча, 4 чалавекі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Увогуле за такія рэчы летась пакараны каля дзвюх соцень службовых асобаў.

— А іншая крайнасць — гэта людзі, якія скардзяцца ва ўсе інстанцыі. Іх называюць прафесійнымі альбо вечнымі скаржнікамі. Як з імі разбірацца?

— Так, ёсць такія. Хоць звычайна пасля Камітэта ўжо нікуды не пішуць. Але некаторыя і тут не спыняюцца. Ёсць такія, для каго скарга — надзённая патрэба: спачатку пішуць на суседа, потым знаходзяць новую аховяру. Часам з дапамогай кантралёраў скаржнікі хочуць задаволіць свае меркантыльныя інтарэсы. Па-рознаму здараецца, аднак мы ім адказваем і тлумачым усё ў адпаведнасці з заканадаўствам. Ну, а калі чалавек хлусіць, то ён можа і адказаць за гэта паводле закона.

— Што б вы параілі тым, хто шукае праўду і дапамогу, але не можа дамагчыся гэтага?

— У кожнага чалавека ёсць права звярнуцца да нас. І мая парада такая: чыноўнікаў трэба прывучаць да парадку. Калі ты нешта не можаш выканаць, зрабіць у тэрмін — растлумач чалавеку, ён будзе ведаць праўду і зразумее. А калі вы атрымалі адпіску і змаўчалі, то гэты чыноўнік і далей будзе рассылаць такія адказы. Трэба да гэтага ставіцца прынцыпова, інакш мы не выкаранім гэтае зло.

— Што б вы параілі са свайго вопыту гаспадарнікам, прадпрымальнікам, дзяржаўным служачым, каб яны не баяліся праверак Камітэта дзяржкантролю, а спакойна працавалі?

— Скажу каротка. Трэба ведаць заканадаўства Рэспублікі Беларусь і выконваць яго.

— Дзякуй вам за размову.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

Тры бліскучыя вынікі на ЦТ па беларускай мове

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Увогуле высокіх адзнак сёлета набралася багата — 99 тэставых балаў атрымалі на ЦТ па беларускай мове 23 абітурыенты, 98 балаў — 36 чалавек, 97 балаў — 31 чалавек, 96 балаў — 54 чалавекі і 95 балаў — 82 чалавекі. І ўсё ж такі пераважная колькасць удзельнікаў тэсціравання апынуліся ў дыяпазоне ад 40 да 46 балаў, а 14 балаў і менш, якія не дазваляюць удзельнічаць у конкурсе, атрымалі 7 працэнтаў ад агульнай колькасці прайшоўшых тэсціраванне.

На цэнтралізаваным тэсціраванні па рускай мове 100 балаў набралі толькі два абітурыенты (летась максімальных вынікаў было чатыры). На 99 балах «спыніліся» 22 чалавекі. 41 чалавек набраў 98 тэставых балаў, 71 чалавек — 97 балаў, 95 чалавек — 96 балаў і 165 чалавек — 95 балаў. Не вытрымалі выпрабаванняў (набралі 14 балаў і менш) 4 працэнты ад агульнай колькасці ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па рускай мове.

У мінулую пятніцу ў Беларусі праходзіла цэнтралізаванае тэсціраванне па геаграфіі — гэта адна з самых малаколькасных дысцыплін уступных іспытаў. Усяго цэнтралізаваны тэст-экзамен па геаграфіі здавалі 1 тыс. 353 чалавекі. Здаваць тэсты па геаграфіі на беларускай мове пажадалі 69 чалавек. 243 чалавекі, або 15 працэнтаў ад агульнай колькасці зарэгістраваных, на экзамен не з'явіліся. У цэнтралізаваным тэсціраванні па фізіцы, якое прайшло ў суботу, узялі ўдзел 46 тыс. 87 чалавек. І зноў жа 10 працэнтаў ад зарэгістраваных, а гэта, між іншым, 6,2 тысячы чалавек, на экзамен не з'явіліся. За розныя парушэнні ад удзелу ў тэсціраванні былі адхіленыя 14 чалавек. Найбольш часта прычынай выдалення абітурыентаў з аўдыторый становяцца мабільныя тэлефоны, якія звоняць у сваіх гаспадароў непасрэдна падчас выпрабаванняў. Згодна з правіламі правядзення ЦТ, праносіць мабільныя тэлефоны ў аўдыторыі, дзе праходзяць тэставыя выпрабаванні, забараняецца. Да таго ж на тэсціраванні па матэматыцы і фізіцы ў ход актыўна ідуць шпаргалкі. Адбіраюцца таксама ў юных «кулібіных» і самаробныя перавагорныя прыстасаванні...

Дарэчы, 25 чэрвеня распачалася рэгістрацыя для здачы цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовы дзень — 4 ліпеня. Рэгістрацыю ажыццяўляюць Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. Сухога, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў папярэдзіў, што зарэгістравацца на рэзервовы дзень змогуць толькі тыя абітурыенты, у якіх былі ўважлівыя прычыны пропуску экзамену (захворванне ці іншыя непрадбачаныя абставіны), якія яны змогуць пацвердзіць дакументальна. Але ўсё роўна ў рэзервовы дзень можна будзе здаць тэст-экзамен толькі па адной вучэбнай дысцыпліне. Для гэтага абітурыентам давядзецца прыехаць 4 ліпеня ў Мінск, дзе на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта будзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне адначасова па 14 вучэбных дысцыплінах. Абітурыенты, якія былі адхіленыя ад тэставых выпрабаванняў па прычыне парушэння правілаў удзелу ў ЦТ, а таксама абітурыенты, якія атрымалі нізкі тэставы бал і жадаюць яго палепшыць, выкарыстаць рэзервовае цэнтралізаванае тэсціраванне не змогуць. Рэгістрацыя на рэзервовы дзень завяршаецца 30 чэрвеня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Будні аховы

ВУЧЭБНЫ ВЫКЛІК НЕ МОЖА БЫЦЬ «ХАЛАСТЫМ»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Упершыню за доўгі час супрацоўніцтва з Дэпартаментам аховы МУС Беларусі фотарэпартаж з Нясвіжскага аддзела «пісаўся» ў жывую. Начальнік падраздзялення маёр міліцыі Пётр Рыцкаў папярэдзіў журналістаў, што ён не ведае, што прыбудзе на адзін з аб'ектаў, дзе планава спрацуе «трывожная кнопка»... Не паспелі журналісты размясціцца насупраць прахадной мясцовага хлебазавода, як туды прымчаўся міліцэйскі экіпаж у складзе сяржанта, міліцыянера-вадзіцеля Дмітрыя Івашкевіча і старшыны, міліцыянера-кіналога Сяргея Крыта ў поўнай баявой гатоўнасці. Пэўна, хлопцы, маглі пакрыўдзіцца на рэпарцёраў: маўляў, у такую спякоту імчыся на «халасты» выклік. Але ж кіраўнік Нясвіжскага аддзела аховы запэўніў журналістаў, што лішняя трэніроўка нікому не пашкодзіць. Галоўнае, быць заўсёды ў добрай форме, што і пацвярджаюць службовыя будні супрацоўнікаў дэпартамента.

Кар. «Звязды».

НА ЗДЫМКАХ: дзяжурная пульта кіравання Наталля КАРПАЧ; міліцэйскаму тандэму ў складзе Дзмітрыя ІВАШКЕВІЧА і Сяргея КРЫТА па сіле любыя задачы.

Крымінал

У ОРШЫ НАПАЛІ НА ТАКСІСТА

У Оршы ў суботу па дапамогу да медыкаў звярнуўся вадзіцель таксі «Бест»: невядомы нанёс яму мноства рэзаных ран шыі і рук.

Каля адзінаццаці гадзін ночы мужчына, якога падвозіў на таксі пацярпелы, знянацку напаў на вадзіцеля з нажом: злачынца параніў сваю ахвяру, завалодаў грашовай выручкай і збег. Праз некалькі гадзін пасля здарэння праваахоўнікамі па падазрэнню ў гэтым злачынстве затрыманы малады чалавек, які раней быў судзімы за рабаўніцтва і хуліганства.

Аляксей ЦІТОЎ.

Жыллё

У РЭГІЁНАХ КВАТЭРЫ ПАЧАЛІ ТАННЕЦЬ

Сёлетняй зімой і ў пачатку вясны назіралася, бадай, самая моцная хваля падаражэння кватэр на другасным рынку сталіцы, а таксама ў абласных цэнтрах і нават у невялікіх гарадах. Тады амаль зніклі з рынку прадаўцы, а з другога боку, трымаўся даволі ўстойлівы высокі попыт на ўсе тыпы кватэр. У чэрвені сітуацыя на другасным рынку жылля кардынальным чынам змянілася. Дырэктар Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай Прасталупаў лічыць, што гэтыя змяненні нельга растлумачыць толькі сезоннымі ваганнямі актыўнасці пакупнікоў і прадаўцоў. Так, мінулым летам кватэры ў сталіцы даражэлі нават мацней, чым вясной. Зараз нават у суседніх рэгіянальных цэнтрах тэндэнцыі на другасным рынку нерухомасці падобныя, але сітуацыі істотна адрозніваюцца.

МІНСКІЯ ПАКУПНІКІ ПАЧАЛІ ВАРУШЫЦЦА

Паводле слоў Мікалая Прасталупава, цэны на сталічнае жыллё стабілізаваліся на даволі высокім узроўні толькі ў другой дэкадзе мая, калі пакупнікі ўвогуле адмовіліся купляць кватэры. Аднак праз месяц патэнцыяльныя пакупнікі зноў пачалі цікавіцца змяненнямі на рынку нерухомасці. Істотны адкат попыту не вельмі моцна спужаў прадаўцоў, якія з вялікімі цяжкасцямі пагаджаюцца скідваць цану і працягваюць чакаць менавіта сваіх кліентаў. Прапаноў сёння на сталічным рынку хапае, ёсць магчымасць выбіраць у любым мікраёне любы тып кватэр. У гэтай сітуацыі сур'ёзныя пакупнікі з рэальнымі фінансавымі сродкамі вырашылі набываць жыллё. Попыт на кватэры ў Мінску застаецца на вельмі нізкім узроўні, але ён ёсць.

ПОПЫТ УПАЎ НАПАЛОВУ, ПРАПАНОВА ЎЗРАСЛА ЎДВАЯ

Сама моцна з рэгіянальных цэнтраў цэны на другаснае жыллё павялічваліся ў Брэсце. Менавіта гэты заходні фарпост з'яўляецца другім горадам у краіне, дзе кватэры на другасным рынку жылля даражэлі мацней за ўсё. У гэтым рэгіёне набыццё кватэр стала не толькі выгадным, але, што галоўнае, перспектыўным накірункам.

Эксперты брэсцкага агенцтва нерухомасці «Альфа-актыў» адзначаюць, што рост цэн на кватэры ў горадзе над Бугам спыніўся толькі ў пачатку трэцяй дэкады мая. Стабілізацыя кошту жыллёвай нерухомасці працягвалася два тыдні, а потым... Попыт на ўсе тыпы кватэр зараз знізіўся прыкладна на 40—50 працэнтаў, а прапанова істотна павялічылася. Месяц таму ў агенцтве было толькі 10 аднапакаёвых кватэр, якія прапанаваліся на продаж, сёння іх ужо больш за 20. Разам з тым на зніжэнне цэн прадаўцы вырашаюцца вельмі неахвотна. Прадаўцоў шмат, але большасць з іх разлічвае ўскочыць у апошні вагон высокіх цэн 2-месячнай даўнасці. Аднак пакупнікі сёння ў «фаворы» і менавіта яны дыктуюць умовы. Зараз пры рэальных здзелках падчас торгу цэны на жыллё магчыма знізіць на 1—2 тысячы долараў.

Цэны ў Брэсце на кватэры вельмі розныя, што залежыць ад плошчы і якасці жылля, узросту і тыпажу дамоў, а таксама адлегласці ад цэнтра горада. Самымі танны-мі лічацца аднапакаёўкі-маласямейкі ў дамах «хрушчоўках». У такіх кватэрах прысядзячай ванне, кухні — 4,5, жылым пакойчыку — 11,4 квадратнага метра ёсць толькі адзін плюс: яны каштуюць каля 27—28 тысяч долараў. Звычайныя аднапакаёвыя кватэры ў пяціпавярховых дамах панэльнага тыпу, але з агульнай плошчай 40—42 «квадраты» каштуюць ужо 42—45 тысяч долараў. Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» на першых ці апошніх паверхах могуць прапанавацца сёння за 41,5—42 тысячы долараў. Стандартныя двухпакаёўкі каштуюць ужо ад 45 да 52 тысяч USD. Больш сучасныя кватэры з палепшанай планіроўкай каштуюць ужо 52—55 тысяч долараў.

Трохпакаёвыя «хрушчоўкі» пачынаюць свой цэннік з 51 тысячы USD. Шматпакаёвыя кватэры сёння ў Брэсце магчыма набыць у новабудоўлях. Квадратны метр такой кватэры без апрацоўкі будзе каштаваць кліенту каля 1000 долараў, а з апрацоўкай 1200 USD.

Спецыялісты жыллёвай нерухомасці Брэста лічаць, што недзе з сярэдзіны жніўня кошт кватэр можа зноў павялічвацца. Аднак падаражэнне ў першыя месяцы восені павінна быць вельмі маленькім, бо назбіраўся вельмі вялікі зап

КОЖНАЯ СУСТРЭЧА — МАЛЕНЬКАЕ СВЯТА...



Падчас сустрэчы ў клубе аўтобуснага парка №2 Бабруйска.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што гэта за агрэгат, Васіль Андрэевіч дагэтуль, толкам не ведаў, перад пачаткам сустрэчы, зразумела ж, разгледзець не паспеў, а шыю напярэдадні застудзіў. Таму ўслых парадаваўся, што цяпер — палечыць. І косці пагрэе.

Павесяліў залу...

Але ж Алена Іванаўна Міткевіч, якая дапамагае ветэрану, упэўнена, што яму толькі інструкцыю ў рукі дай, — любую тэхніку асвоіць.

Будзем спадзявацца.

Прычым не толькі на тое, што печ паслужыць нашаму падпісчыку, — агітуе ён за «Звязду»: усім у вёсцы расказвае, як з ёй шанцуе!

Апроч яго ў Чырвонай Беларусі наша газета прыходзіць у сельскі Савет; даўно і пастаянна выпісвае яе работніца цэха дрэваапрацоўкі спадарыня Петрачкова. У цэлым — выбарам сваім **Ксенія Міхайлаўна** задаволена, хваліла нас, але ж, казала, міжнароднага жыцця малавата. І Янка Крук сваю рубрыку закінуў.

— Для нас — кіраўнікоў сельскіх Саветаў «Звязда» цікавая найперш сваім «Мясцовым самакіраваннем», — адзначыў старшыня сельскага Савета спадар Бандарчук. — Выступаюць у ім многія мае калегі, узнімаюцца вострыя праблемы, даюцца падказкі, як што можна вырашыць... Таму газету варта і трэба чытаць, варта выпісваць.

Ці прыслухаюцца да гэтых слоў жыхары Чырвонай Беларусі, сказаць цяжка. Вёска вялікая (раней тут было досыць буйное прадпрыемства па здабычы торфу), але цяпер народу няшмат. Ранейшай вытворчасці няма, ёсць цэх па дрэваапрацоўцы. Выпускае аконныя рамы, дзверы, дошкі, плінтусы, што-кольвечы з мэблі. Участковая бальніца ўперад была адна з буйнейшых школ у раёне...

Але ж людзі (дзякуючы Быхаўскім ідэолагам, паштавікам і старшыні сельскага Савета) на сустрэчу сабраліся, слухалі нас досыць зацікаўлена, пра нешта пыталі. Таму, пакінуўшы Васілю Андрэевічу Калініну трэці сумленна выйграны прыз, мы паехалі далей. Прычым з надзеяй на пашырэнне кола чытачоў.

Рагачоўшчына сустрэла сюрпрызамі...

Прычым — аж двума. Адзін — ну надзвычай прыемны, другі — якраз наадварот. Калі па парадку — на сустрэчу ў Забалацце загадзя прыехалі аж тры падпісчыцы з вёскі Лучын — загадчыца Дома культуры Надзея Аляксееўна Борыкава, загадчыца бібліятэкі Таццяна Мікалаеўна Царава і фанатка «Звязды» Соф'я Парфір'еўна Кусянкова.

Сюрпрыз другі — больш у Дом культуры... не прыйшоў ніхто. На ўсю моц грымела бязглуздая музыка, блішчэла толькі што памытая падлога, як на здзек, працавалі мікрафоны.

«Людзі зараз... Зараз падыдуць, — казалі нам. — Пачакайце». Спачатку верылі і чакалі — у размовах з Лучынцамі, з паштавікамі.

А час між тым няўмольна збягаў. У выніку, калі людзей і насамрэч крыху сабралася, для таго, каб па-людску, так як прынята ў нас, пагаварыць, правесці сустрэчу, часу ўжо не было — дзейнічаць давялося па скарочанай праграме. Гэта значыць, вельмі коратка расказаць пра газету, правесці віктарыну, паслухаць падпісчыкаў.

— Першы раз, — прызнавалася Людміла Іванаўна Скрыпкіна, — я выпісала «Звязду» гадоў 30 назад і не па добрай волі. Партограм тут быў Аксінчык Віктар Мікалаевіч, прапанаваў... У нагрузку. Я давай адбівацца: «Не трэба мне гэта газета. Не буду яе чытаць». Ён мне кажа: «А ты паспрабуй. Не спадабаецца, — ніхто прымушаць не будзе». Вось з той пары і ўлюбілася. Адзін раз толькі здрадзіла і «вярнулася» назад. Бо «Звязда» для мяне (я ўсім пра гэта расказваю), як нейкі паратунак. Толькі з'явіцца якаясь праблема, не ведаю, што рабіць, — тыдня не пройдзе — газета падкажа. То ў юрыдычнай кансультацыі, то ў медыцынскай, то так, па жыцці. Добра, што пішаце коратка. А то ведаеце — вёска. Зімой яшчэ час ёсць, каб чытаць, а летам... Не заўважыла во нават, што да нас прыедзеце. З пошты пазванілі, дык баклажаны свае кінула, ледзь паспела рукі памыць.

Было аб чым пагаварыць дзвюм «баклажанніцам»: Софья Парфір'еўна Кусянкова з Лучына, друкавала ў газеце артыкул пра тое, як гэтую культуру вырошчвае яна, Людміла Іванаўна, выразаўшы яго, прыняўшы, як кажуць, да дзеяння, мела, што дадаць. Знаёмства адбылося. Значыць ехалі мы не дарэмна...

Хоць па дарозе на Бабруйск думкі і даймалі. Няёмка было перад тымі, хто дабіраўся ў Забалацце з Лучына, за тое, што скомкалі сустрэчу. Відаць, трэба было нікога не чакаць: хто хацеў, — прыйшоў. Тры чалавекі, значыць тры, пяць дык пяць. Але гэта людзі, якім сапраўды цікава было нас убачыць, паслухаць, людзі, якім сапраўды хацелася ўручыць найлепшыя звяздоўскія прызы.

Але ж прэзентацыі газеты на Рагачоўшчыне ўжо праходзілі — і ў самім райцэнтры, і ў Стаўпнянскай сярэдняй школе. Людзі на іх збіраліся, прыязджалі з ваколіц. Што ж адбылося на гэты раз?

Цалкам магчыма, што вінаватыя мы — не параіліся з паштавікамі, паспадзяваліся на спецыялістаў з ідэалагічнага аддзела райвыканкама. Менавіта яны выбралі месца для гэтай сустрэчы, абяцалі абвясціць людзей...

Буракі ў іх, казалі, сена, грады... І мы — усё разумелі. Але ж ведалі і тое, што разагнуцца чалавеку таксама трэба. Няўжо ж не цікава было б — тым жа настаўнікам, старшакласнікам, вясковым бабулям і дзядулям выйсці ў людзі, пасядзець (не на лаўцы, не ля тэлевізара — гэта было пазаўчора, учора і нідзе не дзенецца заўтра), а ў клубе: не кожны ж дзень туды з Мінска журналісты прыязджаюць?

Зрэшты, вёска магла падумаць, што нічога цікавага падчас гэтай сустрэчы не будзе, што ісці на яе не варта. Але тыя ж ідэолагі, як мяркуецца, павінны чытаць газеты, павінны хоць нешта ведаць пра стыль работы рэдакцый, пра дні падпісчыкаў?

— Нават на пошце вашых прыхільнікаў мы б болей сабралі, — зазначыла інструктар па падпісцы Рагачоўскага вузла паштовай сувязі Таццяна Кірылаўна Бабцова.

— У наступны раз прыязджайце ў Лучын, — афіцыйна запрасіла загадчыца Лучынскага дома культуры Надзея Аляксееўна Борыкава. — Мы і людзей запросім, і самадзейнасць падключым... Такое свята зробім — і вёска будзе помніць, і вы.

Сумнявацца ў гэтым не даводзілася. Вось толькі хто ж ведае, як лёс размяркуе суперпрызы, у які бок паклічуць дарогі?

«...Народ на провадзе!»? «Аншлаг» адпачывае

З цяжкімі думкамі (і, зразумела ж трывогай — а раптам зноў нікога?) сталі спяшацца ў Бабруйск, у клуб аўтобуснага парка № 2...

Камень з душы — яшчэ на вуліцы нас сустрэла намеснік дырэктара прадпрыемства Таццяна Уладзіміраўна Ішчанка, а потым, лічы, поўная зала — вадзіцелі, кандуктары, ітээраўцы... З аўтобуснага парка, з суседніх мясакамбіната і Сельмаша, супрацоўнікі аддзела адукацыі...

На ўсякі выпадак (па-беларуску ў горадзе анічога, лічы) спыталі, ці будуць разумець нас?.. З нашай першай дзяржаўнай? Заўсміхаўся народ: «Ну канешне ж будзем!».

І разумелі.

За гады раз'ездаў, дзе толькі ні спыняўся маленькі звяздоўскі дэсант, перад кім ні трымаў ён слова!.. Розныя былі аўдыторыі. Вось такой — не было даўно: нас слухалі, удумліва шукалі адказы на пытанні віктарыны, а ўжо як смяяліся з любімай рубрыкі «Алё, народ на провадзе!», — «Аншлаг» адпачывае.

Гэта, канешне, не гаворыць аб тым, што многія з гэтай залы ў той жа дзень ці назаўтра выпішуць «Звязду». Папрысутнічалі (дзякаваць адміністрацыі Першамайскага раёна Бабруйска! — **Рэд.**), паслухалі, мо нават проста адпачылі... Але ж і даведаліся, што адзіная ў краіне беларускамоўная газета дзевяноты год (!) выходзіць, што стараецца быць патрэбнай і цікавай, што разыгрывае прызы і ладзіць сустрэчы. І што выбар заўсёды ёсць. Ён за падпісчыкам, за чытачом.

Які (нам хацелася б верыць!) будзе помніць імя сваё. І мову. Гэта — перспектыўна, гэта — па-еўрапейску ды і проста па-людску.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК,
Валянціна ДОЎНАР,
Сяргей ПРОТАС.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Фанаты «Звязды» з вёсак Забалацце і Лучын Рагачоўскага раёна

«Мабілізаваць на добрае...»

22 чэрвеня адбыўся ўстаноўчы сход Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Як гаворыцца ў статуце арганізацыі, зацверджаным на ўстаноўчым сходзе, адна з асноўных яе мэтаў — «садзейнічанне пабудове моцнай і квітнеючай Беларусі».

Падчас устаноўчага сходу быў абраны Савет арганізацыі, які складаецца з 23 чалавек — прадстаўнікоў кожнага раёна Мінска. У склад Савета ўвайшлі, у прыватнасці, начальнік аддзела кадраў РУП «Белпошта» Пётр Літвіненка, дэкан факультэта журналістыкі БДУ Сяргей Дубовік, рэктар Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносінаў Валерый Талкачоў, кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Мікалай Ладуцька, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Галіна Юргелевіч і Галіна Палянская.

Старшынёй Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання «Белая Русь» быў абраны рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Міхаіл Батура.

Гаворачы на ўстаноўчым сходзе пра неабходнасць стварэння грамадскай арганізацыі, **намеснік дырэктара прадпрыемства «Гармалзавод № 3» Мікалай ЯЎСЕЙЧЫК** адзначыў:

— Стварэнне грамадскага аб'яднання дазволіць раскрыць свой патэнцыял людзям розных прафесій, якія перараслі па ўзросту Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, але з-за перакананняў і складу характару не жадаюць расставацца з грамадскай дзейнасцю...

Дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Сяргей ПІГАРАЎ падчас свайго выступлення заявіў:

— Неабходнасцю запоўніць нішу паміж «вертыкаллю» ўлады і мільёнамі беларусаў, якія ператвараюць у жыццё планы і рашэнні кіраўніцтва краіны, прадыктавана стварэнне, як мы спадзяёмся, у будучым самай шматлікай грамадскай арганізацыі ў нашай дзяржаве. Асноўная мэта нашага аб'яднання, па майму перакананню, — стварэнне ўмоў незваротнасці тых пазітыўных працэсаў і тэндэнцый у нашым грамадстве, якія атрымалі дынамічнае развіццё ў апошняе дзесяцігоддзе...

Наш рух будзе мець сэнс і дасягне тых мэтаў, якія мы ставім перад сабой, толькі ў выпадку, калі ён будзе масавым, народным, аб'яднае ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў усіх слаёў грамадства. Калі мы здолеем пераканаць людзей у тым, што наша галоўная мэта — дабро для абсалютнай большасці грамадзян нашай краіны. Таму аснова асноў дзейнасці — работа з людзьмі праз стварэнне пярвічных арганізацый па тэрытарыяльна-вытворчаму прынцыпу.

Намеснік дырэктара УП «Мінсккамунцепласетка» Аляксей СЛУЯНАЎ адзначыў у сваім выступленні на ўстаноўчым сходзе арганізацыі:

— Нашай першараднай задачай павінна стаць патрыятычнае адраджэнне насельніцтва...

Адказваючы на пытанні журналістаў пасля ўстаноўчага сходу, старшыня Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Міхаіл Батура адзначыў, што мэтай аб'яднання з'яўляецца «мабілізацыя ўсіх прагрэсіўных сіл на базе беларускай ідэалогіі, ідэалогіі беларускай дзяржавы для вырашэння задач сацыяльнай, эканамічнай стабільнасці.»

Міхаіл Батура дадаў таксама, што задача «Белай Русі» — «перацягнуць на свой бок большасць свядомага насельніцтва Мінска пасля 18 гадоў». «Чаму не? Але гэта перспектыва далёкая».

На пытанне карэспандэнта «Звязды» аб тым, ці збіраецца грамадскае аб'яднанне ўдзельнічаць у парламенцкіх выбарах 2008 года ў якасці асобнай палітычнай сілы, Міхаіл Батура не змог даць адназначнага адказу, бо аб'яднанне яшчэ будзе вызначацца «з тактыкай і стратэгіяй» у бліжэйшы час. «Аднак ні ад якіх грамадскіх мерапрыемстваў, у тым ліку выбараў, мы адыходзіць не будзем. Мы павінны ўплываць на гэта. Бо мы абвясцілі мэты — мабілізаваць прагрэсіўныя сілы на ўсё добрае, патрэбнае», — дадаў ён.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

«Белая Русь» — на Міншчыне

Грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» пачало дзейнічаць і ў маштабах Мінскай вобласці. Напрыканцы мінулага тыдня была праведзена ўстаноўча-выбарчая канферэнцыя, на якой прадстаўнікі з кожнага рэгіёна Міншчыны сабраліся разам, каб стварыць новае грамадскае аб'яднанне ў рамках вобласці. Дагэтуль раённыя арганізацыі ГА «Белая Русь» ужо зарэгістраваныя ў Слуцкім, Лагойскім, Барысаўскім і Крупскім раёнах.

Адным з ініцыятараў стварэння абласной арганізацыі быў Віктар Гумінскі, дэпутат ПП НС, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы. На прайшоўшай канферэнцыі яго выбралі старшынёй савета абласнога ГА «Белая Русь». Таксама вызначыліся са складам кіруючых органаў новага грамадскага аб'яднання.

— Мы не выключаем магчымасці таго, што «Белая Русь» выйдзе на рэспубліканскі ўзровень свайго існавання. Пакуль мы стаім толькі ў пачатку шляху — трэба арганізавацца, — тлумачыць Віктар Гумінскі. — Але ўжо вызначылі мэты і задачы нашага грамадскага аб'яднання. У прыватнасці, будзем займацца інфармаваннем людзей аб унутранай і знешняй палітыцы дзяржавы, пытаннях эканамічнага садзейнічання, культурнага развіцця, аказваць гуманітарную дапамогу. Увогуле, ставім сваёй мэтай дапамагаць ажыццяўляць рашэнні, якія былі вызначаны трэцім усебеларускім народным сходам.

Ідэя стварэння аб'яднання «Белая Русь» зыходзіла «з нізу». Паводле слоў аднаго з удзельнікаў канферэнцыі, генеральнага дырэктара «Беларускалія» Андрэя Башуры, ініцыятыва па стварэнню абласнога аб'яднання належыць людзям працы і навукі:

— Такая арганізацыя павінна быць у рэспубліцы. Яе дзейнасць павінна быць скіравана на вырашэнне сацыяльных пытанняў. Работнікі нашага прадпрыемства падтрымліваюць стварэнне Мінскай абласной арганізацыі «Белая Русь». Як вялікае дзяржаўнае прадпрыемства, якое трывала стаіць на нагах, і якое ўжо некалькі гадоў прыносіць у бюджэт больш за мільярд долараў, мы можам з упэўненасцю сказаць, што дзейнасць грамадскага аб'яднання прынясе вялікую карысць.

Аляксандр ВАЛЯНЦІНАЎ.

ЖЫЛЛЁ ДЛЯ «ЧАРГАВІКОЎ» У СТАЛІЦЫ ПАДАРАЖЭЕ НА 9—14 ПРАЦЭНТАЎ

Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Мінгарвыканкама Алена Пяхота.

Паводле яе слоў, днямі рашэннем Мінгарвыканкама была прынята такая норма, згодна з якой па жылых дамах, якія пачынаюць будаўніцтва з 1 ліпеня 2007 года, работы па правядзенню ўнутрыквартальных сетак добраўпарадкавання і азеляненне новых дамоў будуць ажыццяўляцца за кошт забудоўшчыкаў. Аб'ём фінансавання такіх работ складае прыкладна 9—14 працэнтаў ад агульнага кошту таго ці іншага жылога шматкватэрнага дома.

Нагадаем, што раней гарвыканкамам было прынята рашэнне, згодна з якім з 1 студзеня 2005 года па 1 ліпеня 2007 года гэтыя работы фінансаваліся з мясцовага бюджэту горада. Сёння ў сувязі з масавым будаўніцтвам шматкватэрных дамоў у новых мікрараёнах горад ужо не мае магчымасці працягваць такое фінансаванне, бо ў бюджэце сталіцы на гэтыя мэты зараз не хапае каля 300 мільярдаў рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

Чаму знізіліся заробкі работнікаў фермы?

На «гарачую лінію» газеты патэлефанавала Аксана Аляксандраўна Паранчук з вёскі Новыя Доктаравічы Капыльскага раёна — жонка жывёлавода з цэнтральнай фермы Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Доктаравічы». Прычым сцвярджала, што звяртаецца па даручэнню і ад імя ўсіх сямі работнікаў фермы: жывёлаводаў Маскаліка, Буцько, Паранчука, слесара Кульбіцкага, даяркі Монак і Мяцеж, загадчыцы Брыцько. Сутнасць скаргі датычылася заробкаў: за апошні месяц, у параўнанні з папярэднімі, яны ва ўсіх работнікаў знізіліся на 80—100 тысяч рублёў. «А праца ж вельмі цяжкая, трохразовая дойка, ды зараз спёка... На іншых фермах да 400 тысяч рублёў атрымліваюць, а на гэтай ферме за май даяркі, напрыклад, атрымалі па 260 тысяч рублёў, жывёлаводы — па 190 тысяч, слесар — 150 тысяч. Чаму? Звярталіся да кіраўніка гаспадаркі, ён адказаў коратка, маўляў, як працуеце — так і атрымліваеце...»

Мы патэлефанавалі старшыні Уладзіміру Дземянкову, выклалі яму сутнасць скаргі падначаленых. Дамовіліся, што назаўтра пагаворым на гэтую тэму больш падрабязна — пасля таго як Уладзімір Уладзіміравіч яшчэ раз падрабязна праверыць усе нюансы справы. Назаўтра ні стацыянарныя, ні мабільны тэлефоны Дземянкова не падавалі «прызнакаў жыцця». Давялося звяртацца да начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Капыльскага райвыканкама Ірыны Кісляк. Апошняя абяцала ўсё як след праверыць і разабрацца ў сітуацыі з работнікамі фермы. Вынікі той праверкі праз некалькі дзён нам агучыў начальнік аддзела эканомікі ўпраўлення Генадзь Місевіч.

— Зарплата ў работнікаў цэнтральнай фермы з «Доктаравіч» за май у параўнанні з папярэднімі месяцамі сапраўды знізілася на 40—50—60 тысяч рублёў. Гэтаму ёсць некалькі аб'ектыўных прычын, — паведаміў Генадзь Міхайлавіч. — Па-першае, у тым жа сакавіку—красавіку дзейнічалі больш высокія расцэнкі зімова-стойлавага перыяду, а нядаўна мы перайшлі на расцэнкі летня-пашавага перыяду. Па-другое, на гэтай ферме, напрыклад, за май надоі былі меншыя, чым за той жа перыяд летась. Па-трэцяе, калі б амаль 100 працэнтаў малака ішло вышэйшым гатункам ці першым, за кожную тону работнікі атрымлівалі б 12 тысяч рублёў. А ў іх вышэйшым і першым гатункам было здадзена ў маі толькі 65 працэнтаў малака (у красавіку — 85 працэнтаў), адпаведна, за тону выходзіла менш. Прычына? Дрэнная прамыўка абсталявання. Усе гэтыя фактары ў выніку і паўплывалі на качаткоўы заробак работнікаў. Але і гэта яшчэ не ўсё. Надоі за апошні час на ферме павялічыліся вельмі нязначна. Скажам, калі ў красавіку ад кожнай каровы атрымлівалі ў дзень па 10 літраў малака, дык у маі — усяго 11 літраў.

Як дадаў напрыканцы размовы начальнік аддзела эканомікі ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама, на некаторых фермах сапраўды заробак работнікаў складае і 300, і 400 тысяч рублёў. «Але ж і надоі там у 1,6—1,7 раза большыя. Ды і сам статак можа складаць 200 галоў, а на ферме ў «Доктаравічах» усяго 111 рагуль». Генадзь Міхайлавіч паабяцаў яшчэ раз асобна давесці гэтую інфармацыю да вяскоўцаў. Тым больш што кіраўнік гаспадаркі Уладзімір Дземянкоў, як высветлілася, прысутнічаў і ў кабінеце Ірыны Кісляк, і ў кабінеце Генадзя Місевіча, калі да іх па вынік праверкі звяртаўся журналіст «Звязды».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Тэлесеткі

Тыднёвы «водпуск» Каці Пушкаровай

«Пагартала тэлепраграму на тыдзень — і не ўбачыла на АНТ свайго любімага серыяла «Не нарадзіся прыгожай». Хіба яго зняслі з эфіру, а мо, не закупілі новых серый? Што ж рабіць звычайным гледачам, каб не прапусціць усё самае цікавае?»

Арына Сяргееўна, г. Мінск.

Падобных зваротаў і тэлефанаванняў у панядзелак нам паступіла вельмі шмат. Толькі змірыўшыся з тым, што нечакана перарваўся паказ прыгодніцкага серыяла «Застацца ў жывых» (яго працяг будзе толькі ў новым тэлесезоне), гледачы не пажадалі адмовіцца яшчэ і ад прагляду штодзённай гісторыі «офіснай Папялушкі» Каці Пушкаровай.

У прэс-службе тэлеканала АНТ «Звяздзе» паведамілі, што «Не нарадзіся прыгожай» будзе адсутнічаць у эфіры ўвесь тыдзень — у вячэрнім прайм-тайме серыял саступіць месца трансляцыі святочных канцэртаў у Мірскім замку. Іх АНТ спецыяльна пакажа ў свой «юбілейны» тыдзень, як падарунак сабе і гледачам на 5-годдзе тэлеканала. Так, сёння будзе паказана канцэртная праграма «Залатыя песні «Верасоў», у сераду — выступленне Дзяржаўнага ансамбля «Харошкі» з новай праграмай, у чацвер — канцэрт класічнай музыкі з удзелам салістаў беларускай оперы, у пятніцу — «Дыскатэка 80-х» ад зорак замежнай і савецкай эстрады, у суботу — летняя серыя «Песні года Беларусі». Серыял жа «Не нарадзіся прыгожай» вернецца на належнае месца з наступнага панядзелка.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

МІ-8 ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў КОБРЫНЕ

З вёскі Засімавічы Пружанскага раёна ў Кобрын дастаўлены былы ваенны верталёт МІ-8. Неўзабаве ён будзе ўстаноўлены на пастамент як помнік 65-й баявой верталётнай базе, якая тут дыслацыравалася. Верталёт давялося буксіраваць трактарам, асобна былі дастаўлены лопасці. Ініцыятыву ўзвесці такі помнік у горадзе праявіла раённая арганізацыя воінаў-афганцаў.

Яна СВЕТАВА.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДСТ № 2 Г. ГОМЕЛЬ»

сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 6 июля 2007 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж, конференц-зал.

Повестка дня:

1. Об оказании благотворительной помощи.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

Міністэрства інфармацыі рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне дырэктару РУП «Віцебскаблсаюздрук» Южык Людміле Віктараўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — трагічнай гібелі сына Аляксандра.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» спачувае дырэктару РУП «Віцебскаблсаюздрук» Южык Людміле Віктараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — трагічнай гібеллю сына Аляксандра.

Супрацоўнікі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь Радзькову Аляксандру Міхайлавічу з прычыны напаткаўшай яго цяжкай страты — смерці маці.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне Міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь Радзькову Аляксандру Міхайлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю маці.

Супрацоўнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку сектара Рэдакцыйнага ўпраўлення Бабковай Веры Апанасаўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю брата.

Гульня № 1. Кубак Інтэртота

«Шахцёр» едзе да «Арарата» з добрым задзелам

Салігорскі «Шахцёр» стартаваў у розыгрышы Кубка Інтэртота з перамогі (4:1) над ерэванскім «Араратам» і практычна аформіў сабе выхад у другі раўнд. Галы ў складзе гарнякоў забілі Аляксей Рыас (на 22-й хвіліне), Максім Гукайла (58), Аляксандр Кліменка (69) і Сяргей Нікіфарэнка (81); бразільскі легіянер Маркас Пізелі (41) — у «Арарата».

Пасля перамогі «Шахцёра» галоўны настаўнік беларускай каманды **Юрый ВЯРГЕЙЧЫК** даў нам свой каментарый раўнда.

— Канешне, прыемна, што стартавалі з перамогі. Аднак гульня выдалася няпростая, хоць мы і дамінавалі на працягу ўсёй сустрэчы, — заявіў Юрый Васільевіч. — Я рады, што мы змаглі выйграць з лікам 4:1. Перамозе спрыялі ўдала праведзеныя замены. Упэўнены: у матчы ў гасцях выйграць будзе цяжка, ды і ўмовы там складаныя — высакагор'е, 40 градусаў спёкі. У гэтай сітуацыі наша перавага ў тры мячы дабаўляе ўпэўненасці, і ўсё ж я не магу сказаць, што мы зрабілі вялікі задзел і дакладна ідзём далей. Будзем змагацца і спадзявацца на лепшае.

Нападаючы **Аляксандр КЛІМЕНКА** вызначыўся ў матчы адным голам, таму застаўся не вельмі задаволены сваёй гульнёй:

— Столькі момантаў было! Многае мне не ўдалося рэалізаваць. Якое ў мяне ўражанне ад сапернікаў? Раз мы выйгралі, значыць, былі мацнейшымі, але гаварыць, што мы вышэйшыя за «Арарат» на цэлую галаву, не стаў бы, бо гэта — вельмі дабротная каманда. Якія ў нас шанцы? Цяжка сказаць: у наступным матчы ерэванцы будуць гуляць дома пры сваіх балельшчыках і камфортных для сябе ўмовах. Таму пакуль не прагучыць фінальны свісток, я не ўздыхну спакойна.

Матч у адказ адбудзецца 1 ліпеня ў Ерэване. Пераможца пары выходзіць на адэскі «Чарнаморац». Пажадаем нашым футбалістам удачы.

Ірына ПРЫМАК.

«З ЦЭЛЫМ НАРОДАМ ГУТАРКУ ВЕСЦІ...»

26 чэрвеня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адкрываюцца VIII Міжнародныя Купалаўскія чытанні «Мастацкі свет Янкі Купалы: класічна-анталагічнае і непаўторна-індывідуальнае».

Купалаўскія чытанні маюць даўнюю традыцыю. Яны былі распачаты жонкай Купалы, Уладзіславай Францаўнай, у Вязынцы яшчэ ў 1950-х гадах.

БДУ мог насіць імя Янкі Купалы — з 1942 года

— Апошнім часам сустрэчы ў Вязынцы ператварыліся ў студэнцкія злёты, — расказвае вучоны сакратар музея **Алена БУРБОЎСКАЯ**. — Выдатная традыцыя! Юнакі і дзяўчаты з'язджаюцца не толькі сустрэцца з Купалавай радзімай, адчуць глыбінны подых яго творчасці, але і «сябе паказаць», а таксама аказаць дапамогу: у нас вялікая запаведная тэрыторыя, амаль 22 га.

Сёлета ўвогуле злёт быў унікальны. Выехалі ўсе факультэты Белдзяржуніверсітэта на чале з рэктарам Васілём Стражавым. Кожны факультэт прадставіў сваё бачанне Купалавай творчасці: і паэзіі, і драматургіі, і песні на творы паэта. Нават студэнты-замежнікі, якія навучаюцца ў нас, чыталі Купалавы вершы спачатку па-беларуску, а потым у перакладзе на сваю родную мову.

...Прадставіўшы Купалу, студэнты пайшлі на «гару Парнас». Чыталі свае вершы. Там іх частавалі рэктарскай кашай.

Вялікі падзвіжнік у гэтай справе — Вячаслаў Пятровіч Рагойша, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры тэорыі літаратуры БДУ. Упершыню ён выступіў на Купалаўскіх чытаннях у Вязынцы ў 15-гадовым узросце — і з таго часу заўсёды бывае там. Апошнім часам — разам са сваімі студэнтамі.

Дырэктар музея Алена Мацевасян падаравала Васілю Стражажу вельмі цікавы дакумент. Мы ведаем, што Янка Купала стаяў ля вытокаў стварэння Інстытута беларускай культуры (які потым быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук), а таксама БДУ, многіх іншых устаноў... Дык вось, праз пяць дзён пасля смерці паэта, 2 ліпеня 1942 года, была прынята пастанова аб прысваенні Белдзяржуніверсітэту імя Янкі Купалы. Гэта пастанова не адмянялася. Мы перадалі ксеракопію дакумента рэктару.

Пошукі і адкрыцці

— З цягам часу Купалаўскія чытанні пашырыліся, набылі статус міжнародных навуковых канферэнцый, якія праводзяцца ў Музеі Янкі Купалы раз на два гады. Да нас прыязджаюць купалазнаўцы з усіх куткоў Беларусі, а таксама з Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, Англіі, ЗША. Матэрыялы канферэнцый выдаюцца асобнымі зборнікамі.

Шмат новага адкрываецца на гэтых сустрэчах. Напрыклад, традыцыйна лічыцца, што першы верш Купалы «Мужык» надрукаваны ў 1905 годзе. А гэта не зусім так. У 1903 годзе ў польскамоўным часопісе была апублікавана на польскай мове вялікая падборка — 6 вершаў адразу. А ў 1904-м і Купала, і Колас (ён па-чынаў пісаць па-руску) перайшлі на беларускую мову. Гэта звязана з пастановай цара Мікалая II, у якой указвалася: «Все национальные меньшинства Российской империи могут пользоваться своими наречиями». Быў дазвол на нацыянальную мову. Эканамічны крызіс, перадрэвалюцыйная сітуацыя — каб зняць гэтае напружанне, цар рабіў адпаведныя крокі... Менавіта ў 1904 годзе з'яўляецца беларускамоўны верш Янкі Купалы «Мая доля», напісаны лацінкай. У 2004 годзе Купалаўскія чытанні былі прысвечаны 100-годдзю пачатку беларускамоўнай творчасці Янкі Купалы. Дарэчы, царская пастанова 1904 г. набыла сілу закона 5 мая 1905 г. Таму 15 мая з'яўляецца магчымасць змясціць верш Купалы «Мужык» у рускамоўнай газеце «Северо-Западный край».

Ўсё спаганяць людзі,
пакі ноч шалее.
Вырвуць веру ў шчасце,
веру і надзею,
Ды таго не вырвуць,
што напела маці
Ночкай над калыскай
роднаму дзіцяці.
Ой, не вырвуць
з сэрца цябе, наша слова!
Ой, не ўзяць ніякім
сховам ды аковам,
Як бяруць матулю
у малой дзяціны.
Як бяруць у бацькі
апошняга сына!
(...)
І радзімым словам
рукой мазалістай
Беларус упіша
на старонцы чыстай
Кнігі ўсіх народаў важна,
ў непрымусе
Сумную аповесць
роднай Беларусі.

(З верша «Роднае слова», 1910 год).

На адных з Купалаўскіх чытанняў паэт Янка Запруднік, які жыве ў ЗША, прывёз у дар музею знойдзены аўтограф Янкі Купалы — верш «О так, я пралетар!».

Лёс архіва Купалы драматычны. У 1921 г. паэт здаў свой архіў у Нацыянальную бібліятэку («Ленінку»), але ў час акупацыі Мінска архіў бібліятэкі быў вывезены. Значная частка Купалавых твораў аказалася ў Днепрапятроўску, на Украіне, яны вярнуліся на радзіму. Астатняе — Прыбалтыка, Польшча... Нават у Лондане захоўваюцца некаторыя рукапісы паэта, у тым ліку паэма «Курган».

Міхась Мушынскі прадставіў грунтоўны параўнаўчы аналіз збору твораў Купалы розных гадоў і апошняга Поўнага збору твораў Купалы ў 9 тамах (10 кніг). Каштоўнасць апошняга выдання ў тым, што апублікаваны нават пратаколы допытаў Купалы ў ДПУ. Да гонару паэта, ён нікога не аговарыў: ні сябе, ні іншых. І гэта вельмі важна. Гэта ўзнімае Купалу як асобу, як грамадзяніна, *найсумленнейшага чалавека.*

З ліста Янкі Купалы да старшыні ЦВК СССР і БССР А. Чарвякова ад 22.11.1930 г.:

«Яшчэ раз перад смерцю заяўляю, што я ў ніякай контррэвалюцыйнай арганізацыі не быў і не збіраўся быць. Ніколі не быў контррэвалюцыянерам і да контррэвалюцыі не імкнуўся. Быў толькі паэтам, які думаў аб шчасці Беларусі. Я ўміраю за Савецкую Беларусь, а не за якую іншую.

(...)

Яшчэ адна просьба да Вас. Заапякуйцеся маімі сем'мі, што тут у Менску і ў Барысаве. Я ўміраю з цвёрдай верай у вечнае існаванне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Папрасіце ГПУ, каб не цягалі маёй жонкі. Яна таксама, як і я, ні ў чым не павінна.

Бібліятэку сваю перадаю Бел(арускай) Дзяржаўнай бібліятэцы.

Шчыра дзякую за ўсё тое добрае, што для мяне зрабілі.

Уміраю, прымаючы тое, што лепей смерць фізічная, чымся незаслужаная смерць палітычная.

Відаць, такая доля паэтаў. Павесіўся Ясенін, застрэліўся Маякоўскі, ну, і мне туды за імі дарога».

(Том 8, стар. 113).

У гэтым годзе двухдзённая праграма чытанняў надзвычай насычаная. Уладзімір Сакалоўскі, каліжні прафесар Бонскага ўніверсітэта (ён беларус, многія гады працаваў там), прааналізаваў прысутнасць творчасці Янкі

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.





Форма дзяржаўнага кіравання
Раўнамернае чаргаванне гукаў
Вытворчае аб'яднанне
Марскі рак
Рыба, фота 4
Натуральны водны паток
Эпоха
Пачатак твора
Злак
Ішак
Фота 5
Частка чайніка
Тып самалёта, фота 2
Інструмент наставніка
Прыток Нёмана
Газ, частка паверха
Дзеянне
Памер заработнай платы
Прадукт вытворчасці
Фота 3
Залатая ...
У руках у грыбніка
Маркануўчынец
Інструмент наставніка
"Адзежка" дрэва
Унутранае памяшканне карабля
Пародa сабакі
Нечаканы поспех
Пачатак дня
Свая ... -уладыка
Штучнае рэчышча
Царскі галаўны ўбор
Кавалерыст
Каштоўны камень
Зорка эстрады, фота 1
Аднагорбы вярблюд
Вынік рашэння задачы
Наркатычнае рэчыва
Ганарлівасць у адносінах да іншых
Радзіма Адысея
Халодная зброя
Прыступкі ля хаты
Узнагароджанне за твор
Кошт
Вынаходнік саксафона
Даход, прыбытак пасучасному
Форма яйка ў разрэзе
Хімічны элемент
Парламент Украіны
Афрыканская дзяржава
"Лесвіца ў неба"
Дэкаратыўная расліна
Бягун-марафонец
Вырабляе сыры
Мікралітражка
Ісціна

На пошце... выбіраюць міс

Супрацоўніцы Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» ўпершыню бяруць удзел у абласным конкурсе «Міс Пошта». Ён завершыцца напрыканцы года.

Спачатку конкурс праводзіцца на месцах — у структурных падраздзяленнях. Рэгіянальны абласны этап конкурсу, які пачнецца восенню, уключае ў сябе 5 тураў. Прэтэндэнткам на перамогу трэба расказаць пра сабе, сваю прафесію, прадэманстраваць кулінарныя здольнасці, паказаць нумар мастацкай самадзейнасці, а таксама прафесійна абслужыць кліента, заявіўшы аб сабе, як аб выдатным спецыялісце, ды ў 5-м туры выйсці на сцэну ў вячэрнім касцюме.

Цікава, што да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца ўсе жадаючыя супрацоўніцы, незалежна ад узросту. І, канешне, ніхто не патрабуе адпавядаць знакамітым параметрам фігуры 90—60—90.

Але ж абавязковай умовай з'яўляецца... наяўнасць групы падтрымкі з 5 чалавек. Гэтыя добраахвотнікі павінны таксама прадэманстраваць свае творчыя таленты, групы будуць удзельнічаць у асобных конкурсах. Лепшай групе падтрымкі, незалежна ад выніку «іх канкурсанткі» будзе ўручаны спецыяльны прыз. Па выніках конкурсу, калі пераможцы не будуць супраць, іх фотаздымкі накіруюць у Мінск для камплектавання альбомаў па гісторыі развіцця паштовай сувязі і выкарыстання для вырабу рэкламнай прадукцыі. Безумоўна, ім гарантаваныя каштоўныя прызы і падарункі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Страховое свидетельство по обязательному страхованию ГОВТС на территории Республики Беларусь серии АД № 5069310 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным**.

Асцярожна! Баршчэўнік

З надыходам лета ў Рэспубліканскі апёкавы цэнтр звяртаюцца дзесяткі мінчан. Прычына — вельмі моцныя апёкі пасля «стасункаў» са знешне бясшкодным, але на самай справе небяспечнай раслінай — баршчэўнікам.

— Эфірнае масла гэтай расліны ў гарачыню ядавітае для чалавека, — расказала загадчыца дзіцячага апёкавага аддзялення Рэспубліканскага апёкавага цэнтра Ганна Навічэнка. — Трапляючы на скуру, яны прыводзяць да моцных апёкаў 1-й, 2-й і нават 3-й ступені, якія доўга не загойваюцца. Акрамя таго, гэты «фітаагрэсар» выклікае ў аматараў нефармальных кантактаў з прыродай моцны галаўны боль, млоснасць, галавакружэнне.

У горадзе з баршчэўнікам можна «сустрэцца», прагульваючыся на берагах вадаёмаў, у раёне аэрапорта «Мінск-1», Бальніцы хуткай дапамогі. А ў Лошыцкім парку — сапраўдныя зараснікі гэтай травы. Баршчэўнік — буйная, вышынёй да 4 метраў трава з вялікім лісцем і кветкамі-парасонікамі белага ці жаўтавата-зялёнага колеру. Усім мінчанам урачы раяць трымацца далей ад зараснікаў баршчэўніку і не падпускаць да іх дзяцей. Калі непрыемнасць усё ж здарылася, ні ў якім разе не займацца самалячэннем, а адразу ж звяртацца да ўрача.

Вольга БЕРАСНЕВА, *«Мінск—Навіны».*

Геральдычныя сімвалы

«ГЕРБЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ — АБСАЛЮТНА ЕЎРАПЕЙСКАЯ, ШМАТГАВОРАЧАЯ ГЕРАЛЬДЫКА»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары ад 23 чэрвеня.)

Сёння сакратар Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, галоўны спецыяліст Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь кандыдат гістарычных навук Марына Елінская раскажа пра новаствораныя геральдычныя сімвалы гарадоў Іўе, Свіслач, Скідаль, гарадскіх пасёлкаў Зэльва, Жалудок Шчучынскага раёна, гарадскога пасёлка Астравец і Астравецкага раёна.

Ад гербаў уладальнікаў да багацяў краю

Пяць з шасці вышэйназваных гербаў (за выключэннем герба горада Свіслач) былі створаны на падставе ідэй і распрацовак нашага суразмоўцы ў цесным творчым супрацоўніцтве з мастаком-геральдыстам Віктарам Ляхарам.

— Працэс стварэння геральдычнага сімвала Іўя заняў некалькі гадоў, мы доўга не маглі прыйсці да нейкай адзінай канцэпцыі, — прыгадвае Марына Елінская. — Нагадаю, што гэты горад у пэўным сэнсе ўнікальная з'ява для Беларусі, паколькі тут практычна ў аднолькавых суадносінах пражываюць прадстаўнікі чатырох рэлігійных канфесій: католікі, праваслаўныя, іудзеі і мусульмане. Першапачаткова было імкненне адлюстраваць на гербе нейкім чынам найперш гэту асаблівасць, але ў выніку быў выбраны іншы шлях.

Вывучаючы гісторыю Іўя, спецыялісты звярнулі ўвагу, што гэта старажытны горад. Ім на працягу стагоддзяў — з XV па XIX — валодалі прадстаўнікі многіх вядомых у Беларусі родаў, якія шмат зрабілі для яго. Але, як ні дзіўна, магчыма, прагучыць, асаблівы ўклад у развіццё горада ўнеслі не гэтыя главы родаў, а іх прыгожыя палавінкі — дочкі, жонкі. Прычым гэта былі не адзінкавыя выпадкі — імёнаў жанчын назбіралася вельмі шмат.

Другой асаблівасцю было тое, што ў Іўі дзейнічалі школы (іншая назва — акадэміі), друкарня, рэктарам якой у 1585—1593 гадах быў Ян Ліціній Немыслоўскі. Што азначала ў тыя часы для Беларусі, для асветы тая ж друкарня, тлумачыць асабліва, думаецца, не трэба. Таму на гербе горада было вырашана размясціць жанчыну ў княжацкім строгім, але прыгожым строі з раскрытай кнігай у руках.

Ідэя герба горада Свіслач зыходзіла ад мясцовых уладаў, але была істотна дапрацавана з улікам патрабаванняў геральдыкі Віктарам Ляхарам: уніфікавана па колеру, памеру і форме. Герб выкананы на варажскім ці «прасападобным» шчыце. У верхняй яго частцы адлюстраваны ў зялёным полі залаты зубр з сярэбранымі капытамі і рагамі — адзін з самых буйных прадстаўнікоў Белавежскай пушчы, што сімвалізуе прыроднае багацце. У ніжняй частцы герба мы бачым частку фасада будынка славутай Свіслацкай гімназіі. Будынак быў узведзены ў 1827 годзе, а перад гэтым — у 1804 годзе — Імператар Аляксандр I сваім рэскрыптам даў дазвол на будаўніцтва ў Свіслачы гімназіі — першай школы на тэрыторыі Беларусі, чаму садзейнічаў куратар Віленскай вучэбнай акругі Адам Чартарыйскі.



— Калі гаварыць пра герб горада Скідаля, варта адзначыць адну яго асаблівасць. Геральдыка, асабліва ў дачыненні да адлюстравання архітэктуры, мае схільнасць да сіметрыі. Але на геральдычным сімвале гэтага горада мы бачым зусім іншае: вежы рознай вышыні, з рознай колькасцю вокнаў, іх формай, што адрозніваецца. А справа ў тым, што ў аснову герба, — і мастак-геральдыст цудоўна зразумеў ідэю, — было пакладзена аўтэнтычнае адлюстраванне брамы, якая дагэтуль захавалася. Цяпер, дарэчы, гэта ўваход у гарадскі парк, — тлумачыць далей наш суразмоўца. — Старажытны княжацкі род Чацвярцінскіх, які ўпершыню згадваецца ў 1388 годзе, доўгі час валодаў Скідалем, потым — Радзівілы. І гэты факт, а дакладней, элемент іх родавага герба, узяты за аснову адлюстравання геральдычнага сімвала горада.

Герб гарадскога пасёлка Зэльва Шчучынскага раёна вельмі складаны па кампазіцыі. Тут дарэчы будзе сказаць пра геральдычны тэрмін «блазаніраванне» — ад французскага «blazon», што азначае «трубіць у рог». Раней геральды падчас рыцарскага турніру не толькі трубілі ў рог і аб'яўлялі імя ўдзельніка, але і апісвалі яго герб. Геральдычны сімвал Зэльвы якраз шмат расказвае пра сябе. Ён уяўляе сабой варажскі шчыт, у блакітным полі якога адлюстраваны ўзыходзячы з залатой брамы з чырвоным дахам чорны конь з залатой грывай, капытамі і аброццю.

— Калісьці мястэчка было вельмі заможным, тут праходзілі кірмашы па продажы буйной жывёлы, у тым ліку і коней. У гэтыя дні горад станавіўся сапраўдным цэнтрам грамадскага жыцця, паколькі, акрамя ўласна кірмашоў, тут працавалі шматлікія шынкі, карчмы, пастаялыя двары, зразумела, канюшні. Залаты колер на гербе падкрэслівае заможнасць, геральдычная поза ўзыходзячага каня (верхняй яго часткі) указвае на асноўны прадмет гандлю, — працягвае расшыфроўку сімвалаў Марына Міхайлаўна.

Жалудок вядомы з XVI стагоддзя, на працягу стагоддзяў знаходзіўся ў прыватным уладанні. Пачынаючы з XVIII стагоддзя, ім валодалі прадстаўнікі вядомага на Беларусі роду Тызенгаўзаў (ці Тызенгаўзенаў). Перасяліліся на нашы землі яны з Гальшчыніі праз Літву ў 1198 годзе. Гэты род валодаў гербам «Буйвал», які ўяўляў сабой адлюстраванне чорнага быка на залатым полі шчыта. Ён і быў узяты на ганаровую верхнюю частку герба Жалудка.

— Нават не ведаючы гісторыі ў падрабязнасцях, многія людзі змогуць яго прачытаць. Глядзіце — сем цвікоў у падкове ў ніжняй частцы герба, магія ліча баў. Насамрэч гэта колькасць шляхетных родаў, што валодалі Жалудком. Сам па сабе сімвал «падкова» мае шырокае тлумачэнне, адзін з варыянтаў — поспех, удача, шчасце.

Герб гарадскога пасёлка Астравец і Астравецкага раёна... Мястэчкам валодалі Гоштальды; у другой палове XV стагоддзя кіеўскі ваявода Гоштальд заснаваў тут касцёл і манастыр дамініканцаў. З аднаго боку, як і ў некаторых папярэдніх выпадках, можна было б узяць за аснову геральдычнага сімвала элементы прыватнаўласніцкага герба. Але, па-першае, гэта не зусім адпавядае дзяржаўнай пазіцыі ў геральдыцы, якая патрабуе разнастайнасці ў гербах; па-другое, быў абавязак улічыць пажаданні мясцовых уладаў, насельнікаў горада і раёна. А яны выказаліся за адлюстраванне на геральдычным сімвале прыродных багацяў краю — усяго, што ёсць у наваколлі. Таму мы і бачым дуб — характэрнае для гэтых мясцін дрэва (прычым гэта не проста мастацкі малюнак: яго крона па геральдычных канонах складаецца з 12 — ні больш ні менш — лістоў; памятаеце пра магію лічбаў?). У рацэ (на блакітным краі герба) мы бачым сярэбраную фарэль, прычым павернутая яна ў найбольш ганаровы правы бок шчыта (даўнія чытачы памятаюць — шчыт разглядаецца з боку, як яго трымаў бы ў руках рыцар). Усе элементы герба выдатна спалучаюцца графічна, што робіць яго даволі адметным і цікавым.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Герб горада Іўе. 2. Герб горада Свіслач. 3. Герб горада Скідаль. 4. Герб гарпасёлка Зэльва Шчучынскага раёна. 5. Герб гарпасёлка Жалудок Шчучынскага раёна. 6. Герб гарпасёлка Астравец і Астравецкага раёна.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.46	17.07
Віцебск —	4.20	21.44	17.24
Магілёў —	4.29	21.36	17.07
Гомель —	4.35	21.23	16.48
Гродна —	4.56	21.59	17.03
Брэст —	5.06	21.50	16.44

Імяніны

Пр. *Акуліны, Антаніны, Ганны, Пелагеі, Дзмітрыя, Івана, Савы;* ***К.*** *Дануты, Магдалены, Паўліны, Паўла, Рудольфа, Яна.*

Месяц

Першая квадра 22 чэрвеня
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 26.06.2007

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба: UV INDEX 66

З улікам прагназуемай воблачнасці: UV INDEX 33

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **15 хвілін**.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+14 — +16 °С	МАСКВА	+14 — +16 °С
ВІЛЬНЮС	+15 — +17 °С	РЫГА	+22 — +24 °С
КІЕЎ	+28 — +30 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+20 — +22 °С

Без ападкаў

Дзве даты

26 чэрвеня

1940 год — у Савецкім Саюзе ўведзены васьмігадзінны працоўны дзень, сямідзённы працоўны тыдзень і крымінальная адказнасць за спазненне на работу больш як на 21 хвіліну.

1941 год — на пяты дзень вайны, трэці далёкабамбардзіровачны авіяцыйны корпус на працягу дня наносіў удары па нямецкіх войсках у раёне Радашковічы—Маладзечна, каля вёскі Дзякшаны. Экіпаж пад камандаваннем капітана Мікалая Гастэлы выконваў баявое заданне па знішчэнню варожай танкавай калоны. Самалёт Гастэлы па дарозе назад быў падбіты і загарэўся. Тады лётчыкі (у склад экіпажа самалёта, акрамя Гастэлы, уваходзіў штурман лейтэнант Анатоль Бурдзянюк) прынялі рашэнне накіраваць палаючую машыну на скопішча нямецкіх танкаў і цыстэрнаў з палівам, якія і ўзарваліся разам з бамбардзіроўшчыкам. Нягледзячы на тое, што ў 90-я гады ў расійскай прэсе было нямала правакацыйных публікацый аб гэтым (сцвярджалася, у прыватнасці, што загінуў іншы экіпаж), паказанні сведкаў, лётчыкаў, якія ўдзельнічалі ў тым баі, кажуць аб адным: менавіта Мікалай Гастэла накіраваў падбіты самалёт на механізаваную калону ворага і аддаў жыццё за сваю краіну і Вялікую Перамогу.

Цытата дня:

«Больш карысці прыносіць прамова, якая малымі долямі пракрадваецца ў душу. У агульных меркаваннях, напісаных загадзя і прачытаных пры народзе, шуму многа, а даверу няма».

Сенека.

Усміхнёмся!

Пры ўскрыцці беляша было знойдзена мяса. Выснова: бяляш — драпежнік.

☺

— Дзе расійскія футбалісты гуляюць лепш: у нападзенні ці ў абароне?

— У казіно.

☺

Жонка, якая раніцай прыносіць мужу пахмяліцца, не толькі разумніца, але і прыгажуня!

☺

Злавіў адэсіт залатую рыбку. Яна яму і кажа:

— Адпусці мяне ў мора — я твае тры любыя жаданні выканаю!

Адэсіт:

— Так! Я хачу стаць самым багатым банкірам у свеце. Потым... хачу самую вялікую ў свеце і прыгожую яхту. А яшчэ хачу Шэран Стоун — гэта ра-а-аз!...

☺

Сярэдняя ўраджайнасць пшаніцы — 50 цэнтнераў з гектара. А калі надаваць хамякам па шчоках, дык і ўсе 55 цэнтнераў!

☺

— Алё, гэта ракетная база?

— Не. Вы не туды трапілі.

— Гэта вы не туды трапілі! Хто зараз заплаціць за мой хлеў?!

КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 19 (551)

аддзел рэкламы 287-17-79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

■ Тэрмінова, кватэра 2-пакаёвая па вул. Асіпенкі ў г. Мінску, маюцца балкон, тэлефон, лічыльнікі вады, зялёны двор і добрыя суседзі, 83 тыс. у.а.
Тэл. (8-017) 233-33-40, 8-029-325-67-07.

■ Прадам ці абмяняю 3-пакаёвую кватэру, балкон зашклёны, кабельнае TV, дамафон.
Тэл. (8-01715) 56-360.

■ Кватэра ў 2-кватэрным доме, які будуецца, з майстэрняй, пастаянная справа сямейнаму без ш/звычак, у Брэсцкім раёне.
Тэл. 8-029-801-69-81.

■ Здам на летні час дом побач з возерам Свіцязь, маецца халадзільнік, тэлевізар, вада ў доме, недалёка лес.
Тэл. (8-01596) 31-522, 8-029-287-48-53.

■ Дом з г/п, значны участак зямлі, 3 км ад г. Мядзел.
Тэл. (8-01797) 38-170.

■ Камбайн «Ніва», плуг 4-корпусны, пагрузчык ПГ-03, сеялка СЗУ-3,6, пускавы рухавік да МТЗ, электрарухавік.
Тэл. 8-029-312-73-92.

■ «Опель-вектра» 1992 г.в. бэжавы, 1,7Д, добры стан.
Тэл. (8-02157) 34-413.

■ Самаробны трактар (бензінавы) з прычэпам 20 к.с. без гідраўлікі — 950 у.а., торг.
Тэл. (8-01770) 35-363, пасля 15.00.

■ «Опель-кадэт» 1987 г.в., 1,6Д, седан, на хаду, можна на з/ч, цана па дамоўленасці.
Тэл. (8-01774) 72-981.

■ Пчолы з вуллямі і без, пасека за 5 км ад прыпынку «Радашковічы».
Тэл. 8-029-754-08-85.

■ Трактар Т-40 з прычэпам 2ПТС-4.
Тэл. 8-029-619-66-59, (8-01634) 98-371.

КУПЛЮ

■ З/ч да рухавіка IFA 4/6 VD: каленвал, КПП, ГБЦ і іншыя.
Тэл. (+38093) 510-31-35.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, часопіс «Советское фото» № 4 за 1969 г.
Тэл. 8-029-850-17-29.

■ Дом.
Тэл. 8-029-778-33-38.

■ Памяшканне пад вытворчасць, склад, офіс, магазін.
Тэл. 8-029-682-14-42.

■ Дзяўчына-ўрач шукае 1-пакаёвую кватэру, пажадана ў раёне Мінскага абласнога радзільнага дома.
Тэл. 8-029-883-39-11.

■ Дом на хутары да 70 км ад Мінска, у любым стане.
Тэл. 8-029-357-64-51.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

Выратаваць чалавека!

Усё было добра... Хлопчык рос жвавым, жыццярадасным. Бяда напаткала знянацку. У дзевятым класе ён (Невядомскі Дзмітрый Пятровіч) захварэў — эпілепсія. Маці прыкладвала шмат намаганняў, каб вылечыць сына, а ён настойліва працягваў вучыцца, закончыў школу, завочна тэхнікум, а вось на працу ўладкавацца не ўдаецца. Хвароба не адступае. Даведаліся, што эпілепсію лечаць у адной з клінік Масквы, але надта дорага, курс лячэння 30 тыс. расійскіх рублёў, такіх грошай у іх няма.

Добрыя людзі, просім вас аказаць нам дапамогу для лячэння сына.

На імя Невядомскага Дзмітрыя Пятровіча адкрыты дабрачынны рахунак у г. Слоніме:

№ 3819382100569 у філіяле № 422 ААБ «Беларусбанк» код 152101852, УНН 500159257.
Для лячэння Невядомскага Дзмітрыя Пятровіча.

Шчыра дзякуем за дапамогу.

Тэл. Невядомскіх для даведак (8-01562) 4-66-99.

У вытворчасці суда Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці знаходзіцца грамадзянская справа аб прызнанні памерлым **МАРОЗА Мікалая Мікалаевіча**, 18 мая 1968 года нараджэння, ураджэнца горада Будзёнаўска Стаўрапольскага краю, апошняе вядомае месца жыхарства — сяло Прасковея, вул. Вінаградная, 46 Будзёнаўскага раёна Стаўрапольскага краю.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Мароза М.М., паведаміць іх суду Пастаўскага раёна на адрас: г. Паставы, вул. Крупская, 55 ці па тэл. 4-15-46 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні памерлым **АЛЯКСЕЕВА Уладзіміра Аляксандравіча**, 3 ліпеня 1959 года нараджэння, ураджэнца с. Арлова-Гай Яршоўскага раёна Саратаўскай вобласці Расійскай Федэрацыі, аб якім няма звестак з 1984 года, апошняе вядомае месца жыхарства — в. Луцэвічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Аляксеева У.А., паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У вытворчасці суда Навабеліцкага раёна горада Гомеля знаходзіцца грамадзянская справа аб прызнанні памерлай **СТОГ Людмілы Іванаўны**, 12.04.1954 года нараджэння, ураджэнкі в. Краснае Селішча Гомельскага раёна Гомельскай вобласці. Апошняе вядомае месца жыхарства: г. Гомель, вул. Ільіча, 124-1.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб месцы знаходжання Стог Л.І., паведаміць іх суду Навабеліцкага раёна г. Гомеля на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

З жыцця кантрабандыстаў

Нямецкія «трафеі»

Адразу два факты незаконнага перамяшчэння праз польска-беларускую мяжу гістарычных каштоўнасцяў выявілі супрацоўнікі мытні «Заходні Буг».

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, у пункце пропуску «Варшаўскі мост» падчас агляду аўтобуса «Брэмерхофенц—Масква» ў валізе аднаго з пасажыраў былі выяўлены 2 корцікі, каля 100 медалёў і ордэнаў, іншых ваенных узнагарод і дакументаў салдат вермахта. Нямецкія «трафеі» часоў Другой сусветнай вайны спрабаваў незаконна правезці праз мяжу грамадзянін Расіі.

У другім выпадку кантрабандыстам фашысцкай сімволікі і зброі аказаўся наш суайчыннік. Пад сядзеннем свайго аўтамабіля ён схаваў 6 штык-нажоў, 25 спражак ад салдацкіх папруг і збан-падсвечнік.

Спецыялісты ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама правялі экспертызу памянёных нямецкіх «трафеяў» і ўстанавілі, што яны маюць гістарычную каштоўнасць. Паводле папярэдніх ацэнак, рынкавы кошт гэтай кантрабанды складае каля 10 тысяч еўра.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл/факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.341. Індэкс 63850. Зак. № 3437. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12